# Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 13 (28612) Год LVI | Беласток, 27 сакавіка 2011 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 5%)


# „НІВА” — ДОКАЗ НАШАГА ІСНАВАННЯ

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

Цягам бягучага года рэдакцыя „Нівы” адзначае сваё 55-годдзе. Наш юбілей прыкмеціла Кафедра беларускай культуры ў Беластоку, якая ў рамках беларускіх чацвяргоў наладзіла сустрэчу з галоўным рэдактарам Яўгенам Вапам. Дакладчык, па адукацыі гісторык, пачаў з характарыстыкі стану нацыянальнай свядомасці беларусаў у палове XX стагоддзя.

— Пасля вайны парваліся кантакты і пачуццё еднасці з беларусамі з-за мяжы. Я гэта сам адчуў на сабе, паколькі нарадзіўся ў вёсцы Доўгі Брод — Мацкевічы, непадалёк мяжы. Аднойчы, калі пры нагодзе выбараў прыйшлося мне правяраць пашпарты жыхароў Дубіцкай гміны, я ўсвядоміў сабе адну справу: многія старэйшыя жыхары месцам нараджэння ў пашпартах мелі пазначана БССР або СССР. Для майго пакалення такая звестка падалася незвычайнай. Нягледзячы на складанасці, беларусы жылі сваім жыццём і духам. Калі ў 1956 годзе пачала выходзіць „Ніва”, стала ясна: нельга ўжо перакрэсліць нашага мінулага на Беласточчыне. Вакол газеты актывізаваліся людзі з літаратурнымі схільнасцямі, асветныя дзеячы, самадзейнікі, звычайныя чытачы. Гэты ўздым удала асвятляе ніўскае выданне „Карэспандэнт праўду піша”. Дакладчык прывёў прыклад са сваёй вёскі ад 1960 года. У допісе Надзі Вапы чытаем аб працавітым жыцці пушчанскіх жыхароў. *Усё добра*, — адзначае карэспандэнтка, — *людзі, хоць многія з іх непісьменныя, з цікавасцю чытаюць або слухаюць „Ніву”. Адна бяда, што ў вёсцы няма яшчэ святла...*

*Лена Глагоўская і Яўген Вапа*

Карэспандэнцыі часта выяўлялі глыбокі давер і веру ў вырашальную моц газеты. У якасці прыкладу Яўген Вапа прачытаў фрагмент ліста з-пад Мілейчыч. Справа выглядала нецікава. Паводле аўтара допісу, сусед спецыяльна дабудаваў да яго хлявоў куратнік, ад чаго на яго жывёлу напалі курыныя вошы. Гаспадар не хацеў ісці са скаргай у міліцыю ці ў суд. Ліст канчаўся драматычным запытам: *Парайце, што мне цяпер рабіць?* (адказ рэдакцыі: купіце найперш парашок супроць вошай!).

Ад пачатку свайго існавання „Ніва”, дзякуючы асабістаму прыкладу і ангажаванню рэдактара Георгія Валкавыцкага, спрыяла літаратурным дэбютам і развіццю талентаў. Гэтую акалічнасць пацвердзіў прысутны на сустрэчы паэт Віктар Швед, які 55 гадоў звязаны з нашай газетай.

— Пасля таго, як я даслаў свае вершы ў „Ніву”, Валкавыцкі адразу напісаў мне пісьмо. Ён пахваліў мае вершы і заахвоціў пісаць, — успамінае Віктар Швед. — Сёння, паводле маіх падлікаў, я надрукаваў у „Ніве” больш за дзве з паловай тысячы вершаў. А допісаў і публіцыстычных твораў пакуль не палічыў...

З „Нівай” супрацоўнічалі Уладзімір Караткевіч, Сяргей Новік-Пяюн, Алесь Свісёк, Надзея Артымовіч, Алесь Барскі, Сакрат Яновіч, Ян Чыквін... Літаб'яднанне „Белавежа” — дачка „Нівы”. Тыднёвік таксама можа ганарыцца супрацоўніцтвам з такімі мастакамі, як Лявон Тарасэвіч, Мікола Давідзюк, Тамара Тарасевіч, Уладзіслаў Петрук, Стэфан Рыбі, Пятро Біруля...

— „Ніва” ад пачатку ўздымала справу нацыянальнага гонару, — адзначыў Яўген Вапа. — Нам пісалі беларусы з усяго свету. Нягледзячы на рэжым цэнзуры, газета была адкрыта на допісы беларусаў Аўстралі, Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі, Заходняй Еўропы і СССР. Шмат такіх карэспандэнцый, твораў і дакументаў захоўваецца у архіве тыднёвіка. У ім таксама фатаграфічная ілюстрацыя Беласточчыны XX стагоддзя. Сярод творчых асветна-культурніцкіх ініцыятыў нашай рэдакцыі трэба назваць журналісцкія і мастацкія майстар-класы „Сустрэчы «Зоркі»” і літаратурны семінар „Бязмежжа”. Не без значэння і выдавецкая дзейнасць. У серыі ніўскіх выданняў ужо 45 кніжак. Апошняя з іх *Па жвіроўках, асфальтоўках* Аляксандра Вярбіцкага падводзіць наш незайздросны дэмаграфічны і нацыянальны стан на Беласточчыне ў пачатку XXI стагоддзя.

На пытанне пра перспектывы і планы газеты Яўген Вапа адказаў адным сказам:

— Лёс газеты ў руках чытачоў.

Руская песня „Малиновый звон” — беларускі тэкст да гэтай песні напісаў **Алесь Барскі**

## *Спявае малінавы звон*

**Прысвячаю Юрку Валкавыцкаму**

*Спявае малінавы звон*
*У лістоце пушчанскіх карон,*
*Гудзе ў белавежскай глушы,*
*Пяе ў беларускай душы.*

*Айчына — любоў і краса,*
*Нябёсаў блакіт быццам лён,*
*Пад нагамі як пэрлы раса,*
*Беларусь — мой малінавы звон.*

*Спявае малінавы звон,*
*Нашы сэрцы бярэ ў палон,*
*І таму пакланіся зямлі,*
*На якой нашы продкі жылі.*

*Пад звон да хрышчэння няслі,*
*Пад звон да вянчання вялі,*
*І на вечны спакой, вечны сон*
*Вязлі пад малінавы звон.*

*Стрымгалова імчацца гады,*
*Стаецца старым малады,*
*Мінае жыццё нібы сон,*
*Але вечна юначы ёсць звон.*

*Таксама мяне правядзе*
*У родным Юшковым Грудзе*
*У вечную ціш, вечны сон,*
*Любы малінавы звон.*

*Колькі яшчэ прыйдзе жыць,*
*Колькі начэй, колькі дзён,*
*Ды хай нам заўсёды гучыць*
*Родны малінавы звон.*

**Варшава 27.02-01.03.2011**


## Запрашэнне

25.03.1918 **БНР** 25.03.2011

**Святкаванні 93-х угодкаў**

**Беларускай Народнай Рэспублікі**

**адбудуцца 25 сакавіка (пятніца) у Беластоку ў цэнтры Ваяводскага асяродка анімацыі культуры „Сподкі” па вул. Святога Роха, 14 ў Беластоку а гадз. 18.00 (уваход свабодны)**

**У праграме:** даклад прафесара Алега Латышонка пра першага прэм'ера ўрада БНР Язэпа ВАРОНКУ родам з Сакольшчыны, дакументальнае кіно Юры Каліны і Ганны Кандрацюк пра Яна Тарасевіча, а таксама канцэрт беларускіх патрыятычных песень.

Запрашаюць: Радыё Рацыя, „Ніва”, Беларускі саюз


Янка ТРАЦЯК

## *Сэнс*

*Шукаеш рай...*
*Свой Дух над краем скуты, —*
*тут іншы дух...*
*Над родным словам цэнз...*
*І травіць Кон душу*
*зямной атрутай, —*
*такі наш рай...*
*Які у гэтым сэнс?..*

*Памкненняў бег —*
*жыццё, што марны лямант.*
*Імчыцца ўздоўж стракаты*
*транс-экспрэс...*
*А ў небе бел-чырвона-белай плямай —*
*распяты Бог...*
*Які у гэтым сэнс?..*

*Крычы: „Стоп кадр!”,*
*крычы, гукай — пустыня,*
*адвечны шлях, бяда, гульба, прагрэс...*
*На волю лёсу Бог народ пакінуў*
*шукаць свой рай,*
*шукаць той самы сэнс.*

*А там, а там...*
*Гісторыя з працягам...*
*Душой гібець*
*— такі ўжо тут працэс,*
*А ў небе з бел-чырвона-белым сцягам —*
*Жывы Хрыстос...*
*І ў гэтым, можа, сэнс!*

9 770546 196000

# Свята з прысмакам

25 Сакавіка — гэта асаблівая дата ў беларускім календары. Гэта галоўнае нацыянальнае свята, якое ніяк, на жаль, не можа стаць дзяржаўным, увасобіць спрадвечныя беларускія мроі. І тут з прыкрасцю можна канстатаваць, што сто гадоў перыядычнага змагання за сваю асобнасць і суверэнітэт так і не прынеслі чаканай вольнасці. Нібыта на мапе Еўропы існуе такая дзяржава — незалежная Рэспубліка Беларусь, але пасутнасці гэта квазідзяржава, чужая для беларусаў, якая мае каланіяльную расійскую адміністрацыю і многія прыкметы расійскай ускраіны. Гэта сапраўднае дзікунства, што сёння беларусы не могуць узняць на Дзень Волі свой нацыянальны бел-чырвона-белы сцяг. За яго ўздыманне ці вывешванне затрымліваюць, даюць вялікія грашовыя кары ці садзяць у турму. Гэта дзікунства, але гэта факт. Факт, што мы перажываем невядомы ў гісторыі перыяд калабарацыі, перыяд канфармізму і прыстасаванства бальшыні да навакольнай рэчаіснасці. Бальшыня хоча жыць нармальным у нейкім сэнсе мяшчанскім жыццём: хадзіць на працу, размнажацца, адпачываць на моры, уладкоўваць свае кватэры, дамы і гаражы, мець добрыя машыны. Нічога заганнага ў такіх памкненнях няма. Але ж ёсць і старая як свет біблейская мудрасць — не хлебам адзіным жыве чалавек. І вось тут упіраемся ў тое, што няма сярод нашай нацыі сапраўднай грамадзянскай супольнасці, няма належнай салідарнасці, няма разумення галоўнага — у якой сітуацыі мы знаходзімся. Усё гэта нібыта спакваля выспявае, брадзіць, фармуецца, гуртуецца, збіраецца і накопліваецца. Пытанне толькі — ці працэс гэты завершыцца?

Падзеі 19 снежня 2010 года выразна паказалі, што актыўная частка грамадства хоча перамен, стамілася ад савецкага маразму, ад хлусні дзяржаўнай прапаганды. Што зноў ёсць людзі, здольныя ахвяраваць самым дарагім у сваім жыцці дзеля вольнасці сваёй краіны. Аднак, крытычнай масы для кардынальнага павароту да нармальнасці яшчэ недастаткова. Гутарка тут не пра тое, што ўсе павінны па першым поклічы выходзіць на вулічныя акцыі пратэсту і рабіць радыкальную рэвалюцыю. Насамрэч форм негвалтоўнага грамадзянскага супраціву даволі шмат і яны могуць стаць досыць эфектыўнымі. Прыкладам байкот у розных яго праявах: байкот спартовых спаборніцтваў і эстрадных канцэртаў, усялякіх забаўляльных шоў і праграм; па магчымасці байкот дзяржаўных крамаў — многія прадукты і тавары можна купіць у прыватнікаў; байкот і ігнараванне дзяржаўных газет і тэлебачання. Кожны чалавек здольны на такога кшталту маўклівы пратэст, на няўдзел у чужым, фальшывым, падманным. Кожны чалавек здольны не зрабіць нечага на сваім канкрэтным месцы, што супярэчыць яго светапогляду і сумленню.

25 сакавіка — гэта зазвычай пачатак сапраўднай вясны, так чаканай у нашых шыротах пасля зацяжной і нуднай зімы з яе маразамі і вятрамі, невыноснай вільготнасцю, якой хіба няма нідзе на свеце. Вясна — гэта заўсёды абуджэнне, ажыванне і адраджэнне. „Толькі з кожнай вясной усё вастрэй адчуванне фіналу", магчыма нас стамляюць гады і палітычныя паразы, здзекі над беларускай культурай, дыскрымінацыя нашай беларускай мовы. Але ж і „скалу прабівае расток"!

25 сакавіка — гэта яшчэ і Звеставанне паводле аднаго з каляндарных стыляў. Вялікдзень сёлетняй вясной будзе сустракацца ўсімі канфесіямі разам. Іерархі асноўных канфесій не з беларускім народам, а з дзяржаўнай уладай, якую яны адкрыта і лісліва абслугоўваюць. Гэтае фарысейства таксама ва ўсіх на вачах, яно падкрэсленае, вылучанае і відавочнае. Беларусы і тут кінутыя і зняважаныя ў сваіх пачуццях. Толькі вельмі важна адрозніваць Бога і яго афіцыйных „дылераў" на зямлі. Вельмі важна разумець таксама і выраз „усялякая ўлада ад Бога" не як асвечанасць дзейснай улады Вышэйшай сілай, а як вынік Божага провіду і папушчэння.

Дзень 25 сакавіка — светлае свята беларусаў усяго свету з прысмакам горычы. Свята чарговай надзеі з прысмакам маральнай стомленасці. Свята Адраджэння з адчуваннем фатальнай непазбежнасці, што ўсё ізноў паўторыцца...

**Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ**

# Супляменнік мовы

Калі хтосьці папракне мяне, што не люблю дзяцей, рашуча адкажу, што ён памыляецца. Я вельмі не люблю дзяцей. Але іх паважаю, так як паважаю сваё дзяцінства з-за памяці самых інтымных хвілін праведзеных з мамай, калі чытала мне казкі. Не падзяляюся аднак хваляваннямі, якія прыносіў у той час яе цярплівы голас, паколькі яны — немагчымыя для перакладу. Бо як жа апісаць дзіцячыя гнеў, жах, радасць і сум, адчувальныя ў адзін момант, у максімальным фізічным і псіхічным перажыванні, калі слухаў андэрсэнаўскіх казак, напрыклад тую пра бусла, пра грэчку ці тую пра голага караля? Да сёння з чуласцю захоўваю тое інтэнсіўнае здзіўленне, што дарослых найбольш узварушвала не тое, што той кароль строіўся ў густыя шаты канвенцыяў, ілюзій, комплексаў і чаго там яшчэ, аб чым як дзіця я інтуітыўна ведаў, а што яны неабавязкова хацелі ўбачыць, а тое, што кароль аказаўся на канец быць голым.

Нядаўна вяртаўся я на аўтобусе дахаты ў вёску. Быў прыгожы сонечны дзень і людзі, змардаваныя сёлетняй зімою, таксама паказваліся нейкімі прамяністымі. Да часу. На адным з прыпынкаў увайшла ў аўтобус мама з дзіцём, якому было гадоў пяць. Не пра тую маму гаворка, ды дзіцё цяжка было перанесці. Урэднае, крыклівае, распушчанае. І зараз спахмурнелі міны пасажыраў, таму што яго пытанням, а чаму і нашто, не было канца. А найгоршае тое, што патрабавальна, ападыктычна і гучна дамагалася яно адказу. А распытвала пра ўсё гэта на мове заплеценай у касу слоў з беларускімі каранямі і часта польскім скланеннем. Можна было меркаваць, што штодзень да яго гавораць „па-свойму", што мова тутэйшая з'яўляецца яго матчына-малочнай мовай. На жаль, тая мама, невядома чаму, палохалася гэтым і, кідаючы па баках збянтэжаным позіркам, востра напамінала малога, каб „*mówił przy ludziach ładnie*". Прыгожа, значыць — па-польску. „*Ale dlaczego?*" — здзіўлялася па-свойму дзіця.

Айчынай майго дзяцінства з'яўляецца мова Бжэхвы, Бэлзы, Тувіма ці Капніцкай, у якой я рос ад найранейшых гадоў. Уражлівасць на націск, на інтанацыю, на сінтаксічную дынаміку, ідыёмы і ўсе тыя незвычайныя „пшы" і „хшчы" высмактаў я з вершыкаў і казак іхняга аўтарства. Таксама з матчынай артыкуляцыі, інтанацыі, стылю маўлення, калі іх чытала. „Стыль не ёсць, як думка, касмапалітычным: мае сваю родную зямлю, неба, сонца" — адзначыў у „Замагільных запісках" Шатабрыян.

Несумненна ў маіх адносінах да маёй роднай мовы змяшчаецца нейкі эдыпавы аспект — гвалтую я яе сваімі літаратурнымі стараннямі. Можа таму, што асноўныя паняцці: неба ці сонца ўкараніў у маёй свядомасці мамін голас. А можа таму, што абцяжарыла яна маё дзяцінства тувімаўскімі слоўнымі гульнямі, што прымушалі мяне да інтэнсіўнай эксплярацыі гукаў, а гэта пераклалася на жарснае чуццё голасавай шчыліны, вуснаў і мышцаў языка. Ужо само назіранне яго кончыка, што ўзвіваўся паміж дзяснамі і зубамі пры маўленні слова „Шчэбжэшын" стала нейкім сексуальным, а „*chrząszcz brzmi w trzcinie*" гучыць да сёння ў маіх вушах як самы гожы эротык. Ды ці тое адчуе, скажам, француз?

Ідыяматычнымі моўнымі выкрутасамі можа пахваліцца кожны народ. Адпаведнікам шчабжашынскай глосы ў нямецкай мове з'яўляецца „*Fischer Fritz fischt frische Fische, frische Fische fischt Fischer Fritz*"; у ангельшчыне — „*Sea sells sea-shells on the sea shore*" — не да вымаўлення славянскімі нацыямі. Ані да скумекання. Бо, як заўважыў Шатабрыян, чым больш мова свойская, нацыянальная, тым больш яе сакрэты скрываюцца перад розумам, які не ёсць, так сказаць, яе супляменнікам.

Супляменнікам „сваёй" мовы аказалася апісанае мною дзіцяня, што адсланіла голую праўду, якой не магла ўбачыць ягоная маці. Што мова прыгожая, калі яна сапраўдная. „Гэта ты брыдка гаворыш!" — адказала дзіця на яе заўвагу, каб гаварыла „ładnie". Вядома, сказала гэта „па-свойму".

**Міраслаў ГРЫКА**

**Вачыма еўрапейца**

# Прынцып умоўнасці

Ад гадоў прыслухоўваюся штогадовым сеймавым выступленням чарговых міністраў замежных спраў. Так было і ў гэты раз, калі ў палове сакавіка кіраўнік МЗС Радаслаў Сікорскі прадставіў інфармацыю аб прынцыпах польскай палітыкі ў гэтым плане на бягучы год. У першых сказах гаварыў:

— Польша з'яўляецца штораз важнейшым партнёрам Захаду, ды наша трансатлантычная сям'я не з'яўляецца ўжо пупком свету. Незалежна ад таго, што надалей багацеем і ёсць у нас рэальныя абарончыя здольнасці, іншыя багацеюць хутчэй. Еўропацэнтрычны свет, які мы прывыклі трактаваць як відавочнасць, адыходзіць у мінулае.

Далей было аб патрыятызме:

— Патрыятызм гэта не цёмныя намёкі або фанабэрыстыя прамовы. Найбольшым патрыётам не з'яўляецца той, хто найбольш гаворыць пра патрыятызм, а той, хто рэальна робіць штосьці дзеля Польшчы.

Зараз пасля пра гонар:

— Паказуха са скажона тлумачаным гонарам таксама не выклікае захаплення (...). Сёння наша дзяржава змагаецца за месца на міжнароднай арэне, а не за гонар, якога ніхто нам не можа адабраць. Нікому нічога не мусім даказваць.

Міністр Сікорскі ўспомніў пра гаспадарчыя поспехі Польшчы і м.інш. пра задачы, якія стануць перад нашай краінай у час яе прэзідэнцтва ў ЕС у другой палове гэтага года, а таксама пра патрэбу добрых зносін з суседзямі, значыць, з Нямеччынай і Расіяй.

Я чакаў — дарэчы, як заўсёды — таго, што кіраўнік польскага МЗС у гэты раз скажа аб адносінах з Беларуссю, асабліва таму, што ў параўнанні з мінулым годам сітуацыя ў гэтай краіне змянілася. Чакаў я слоў, якія акрэсляць польскі стасунак да дзяржавы, якая пасля здарэнняў звязаных са снежаньскімі прэзідэнцкімі выбарамі — на маю думку — не дае шанцаў на вядзенне ў адносінах да яе г.зв. мяккай палітыкі, якую прымяняла Польшча, а і ўвесь ЕС яшчэ да нядаўняга часу.

Прывяду фрагмент выказвання Радаслава Сікорскага наконт Беларусі ў цэласці:

— Палітыку ў адносінах да Беларусі вызначае прынцып умоўнасці. Лёс брацкага і еўрапейскага беларускага народа нам асабліва блізкі. Шмат разоў я паўтараў, што Польшча асабліва можа памагчы Беларусі, калі тая пойдзе дарогай перамен. Мусім, аднак, рэагаваць у аднолькава рашучы спосаб, калі Беларусь з тае дарогі паварочвае назад, прытым парушаючы элементарныя чалавечыя і грамадзянскія правы. Веру, што прыйдзе час, калі будзем маглі аказваць падтрымку рэфарматарскай і садзейнічаючай з Еўропай Беларусі.

Цікавым было ў гэты раз, што беларускае пытанне апынулася ў інфармацыі міністра зараз пасля абмеркавання адносін з Нямеччынай і Расіяй, зараз пасля Украіны, ды перад Вышаградскай групай (побач Польшчы ў яе складзе Чэхія, Славакія і Венгрыя) і Літвой. Аб Беларусі ўспамінаў Радаслаў Сікорскі яшчэ пазней, прыводзячы словы Гарацыя: „Калі сцяна суседа палае, гэта таксама і твой клопат".

Прамаўляў:

— Салідарнасць для палякаў паняцце асаблівае. У падтрымку беларускага грамадства ангажуецца не толькі адміністрацыя, але перш за ўсё дзесяткі польскіх няўрадавых арганізацый.

Прыгадаў студзеньскую канферэнцыю, у час якой дэлегацыі дзяржаў і міжнародных арганізацый дэкларавалі падтрымку дзеля дэмакратызацыі Беларусі вартасцю ў больш за 87 мільёнаў еўра. Пасля выслухання міністра мне здаецца, што сёлета ў польскай замежнай палітыцы Беларусь фактычна будзе займаць важную ролю, асабліва што „адчувальным месцам" у час польскага прэзідэнцтва ў ЕС будзе рэалізацыя праграмы „Усходняе партнёрства", якая ахоплівае і Беларусь.

**Мацей ХАЛАДОЎСКІ**

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

# ДЗЕНЬ СОЛТЫСА

**Сакавіцкая зімка трымаецца! — хоць сонца асляпляльна ззяе над Новым Лякоўвам, Янка Целушэцкі ад рання лятае па сваім салэцтве ў цёплай куртцы. Рэдка яго заспееш у драўлянай роднай хаце. На ёй цяпер няма паштовай скрынкі, а чырванню высока свеціцца новенькая табліца „SOŁTYS”.**

— У нас выбары былі трэцяга сакавіка. У святліцы ў Старым Ляўкове, — гісторыя яшчэ свежая, і ўсхваляваны Янка Целушэцкі дае дакладную справаздачу з важнай грамадскай падзеі.

## *Кандыдатаў было трох*

— я, Ян Стоцкі і Мікалай Лаўрэшук. Лаўрэшук быў ужо два тэрміны солтысам, а яшчэ перад ім быў Стоцкі. Так што я меў перад сабою двух вопытных солтысаў. І добра яны ведалі кожнага чалавека ў Новым Ляўкове — хадзілі па хатах, збіралі падаткі, гаварылі, спатыкаліся... Першым дзіўнае было, што хтосьці там з залы (цяпер ведаю што Генік Харкевіч) хацеў мяне кінуць, як то гаворыцца, на глыбокую ваду: „Янак Целушэцкі! — пабачым, колькі здабудзеш галасоў”, — першы сарваўся, падаў маю кандыдатуру. Запісалі. Зараз падалі Лаўрэшука і Стоцкага, сваякі. На выбары з’ехаліся нават тыя, хто толькі прапісаны ў Новым Ляўкове. Паціху гаварылі, што кожны сваю хатнюю дружыну прывёў... Закрылі спісак кандыдатаў. Раней дапусцілі да голасу памежнікаў і паліцыянтаў — была ім нагода расказаць пра сваю дзейнасць і поспехі ды асцерагчы сялян перад рознымі небяспекамі. Ні войт, ні намеснік павятовага старосты (ён наш жыхар) не прадстаўлялі кандыдатаў. Выбралі падліковую камісію — Андрэя Барэчку, Яўгена Кардаша і Фёдара Казлоўскага. У тайным галасаванні прыняло ўдзел 65 асоб. На паасобных кандыдатаў прагаласавалі наступным чынам: на Яна Целушэцкага — 45 важных галасоў, на Мікалая Лаўрэшука — 17 галасоў, на Яна Стоцкага — 2 галасы. Голас няважны быў адзін. У выбарах у салэцкую раду заяўлены былі: Марыя Крышань, Уладзіслаў Красноўскі, Аляксандра Ляшчынская і Славамір Смольскі. Усе гэтыя асобы ўвайшлі ў раду. Што цікава, з 65 асоб да выбару салэцкай рады засталося 52! І галасоў няважных ужо не было.

## *Солтыса выбіраюць на чатыры гады.*

— Набегаешся!

— Добра, што я тут арыентуюся. Я тут нарадзіўся, нават у гэтай хаце, у якой мы сядзім, а не ў якой Гайнаўцы ці Беластоку. Прыходзіла з канца вёскі павітуха Феня, прымала дзяцей. Людзей я ведаю..

Адразу пусцілі нас на глыблоку ваду — сказалі прыехаць у гміну, узяць плацежныя наказы, далі нам квітарыюшы, і не салгу як скажу, што шмат ужо сабраў падатку. Людзі кажуць, што вельмі добра, што на месцы можна, не трэба ехаць у Нараўку, у гміну ці кааператыўны банк. Скажам, сёння — мне ўплацілі пяць чалавек. Я іду да іх. Нясу ім плацежны наказ, яны глядзяць як і што, пытаюцца: ці можна табе адразу? І адразу выпісваю ім квіток. Да 15 сакавіка тэрмін усё сабраць. Калісьці мой брат быў солтысам, Косця. Давалі ім касету на ключык, а касету можна было так прымацаваць, прыкрунуць, каб ніхто яе не адарваў. Ну, схаваў я маёмасць аднасяльчан так, што ніхто не знойдзе. Дарэчы, неўзабаве адвязу ў гміну... Заходжу цяпер да людзей, дзякую за тое, што пайшлі на сход. Вельмі цешыць тое, што

## *людзі не падвялі.*

Ніхто з тых, што паабяцаў прыйсці, не адмовіўся. Праўда, адзін паабяцаў, ды не мог выканаць грамадскага абавязку, паколькі паліцыя якраз перад галасаваннем наклала яму на нагу дазіметрычны „ашыйнік” і не мог ён пакінуць падворка пасля 18 гадзіны (пакараны „веласіпедыст” — тры разы падпаў выпіўшым на ровары — выпушчаны ўмоўна з турмы). Я нават машыну па яго выслаў — ды не пусцілі. Падабаецца мне, што Барыс Казлоўскі ўсёй сям’ёй прыехаў з далёкага хутара. Некаторыя падвозілі на сваіх самаходах суседзяў. Далекавата нам было дабірацца ў святліцу ў Старым Ляўкове — амаль 3 кіламетры. Старэйшыя жанчыны махалі рукою: „Янка, я не зайду!”. Кажу ёй: „Ну не кажы, што не дасі рады зайсці, ты ж можа два гады старэйшая за мяне!” — „Калені баляць!” Старэйшым жанчынам няма з кім паразмаўляць — дзеці павыязджалі, адны засталіся, дык пагаварыць хочацца, адазвацца да кагось. Хочацца паспачуваць, хочацца, каб яе паслухалі... Кажу суседцы, што Зінка не хоча на выбары ісці, бо ногі баляць. „Зінка? Перастань! Зінка як ідзе да *склепу*, то як струна!” Я зайшоў да Зінкі: „Зінка, не бі ў хамут! Люба мне сказала, што ты так ходзіш!..”. Смяецца! Пайшла! Найлепш каб адступіцца, не ісці. Я ведаю, чаму людзям не хочацца ісці. Разумею старых. Што „на доле” — іх ніякая функцыя ўжо не чакае. Але ёсць такія, што і зайздросцяць, або маюць яшчэ нейкія справы. „Я не хачу наразіцца... Я за чатыры гады сам буду кандыдаваць... Гэта каб мне самому на зашкодзіла. Калі буду падтрымліваць тваю аптацыю, а пасля за мною не пойдуць тыя...” Солтыс павінен ведаць справы сваіх сяльчан і разумець іх.

— Тут-тук! — у хату ўваходзіць селянін Коля, былы вучань цяперашняга солтыса. Становіцца нясмела на чыстым парозе кухні, перад паласатым палавіком — думае разувацца. — Посуд трэба збіраць.

— Ведаю, Мікола. Не разувайся. Зайду ў чатыры гадзіны. Хадзі сюды. Хачу спытацца ў цябе пра адно. Быў я ў цябе раней, на дзвярах картку павесіў... Возьмеш наказ — падпішыся. Тут дата: 11 сакавіка 2011 года. Пра Міколу Сахарчука магу сказаць вельмі многа цёплых слоў. Сарганізаваў у сваёй хаце прыём для аднавяскоўцаў пасля выбараў. Заявіўся раней да мяне: „Я хачу ўключыцца ў тваю выбарчую кампанію. Ты двума галасамі прайграў выбары на раднага, а гэта і мая віна, бо не быў прысутны на выбарах, якраз быў у Варшаве.

— Бывае, што людзі зайздросцяць. Невядома чаго зайздросцяць. „А нашто яму ўжо больш!? — кажа. — Быў радным, то і хваціць. Нахапаўся ўжо!” Я нахапаўся? Новая гмінная рада была вызначыла свае дыеты на шэсцьсот ды вярнуліся да старой, прысаромленыя. Але тут справа не ў грашах, а ў тым, каб штосьці

## *для вёскі зрабіць.*

А я стараўся для вёскі штосьці рабіць. Калі адрамантавалі наш аўтобусны прыпынак, тратуар ад гэтага месца дайшоў аж да ваяводскай дарогі, дашок-помнік каля школы хацелі ўжо зваліць, — адрамантавалі... З гэтым дашком пан войт быў на мяне ўжо злосны. „Пане Янка, вы такі сантымент маеце да вёскі, да школы, бо вы там вучыліся, працавалі, і толькі вы адзін дамагаецеся таго рамонту!” — „Прашу зрабіць вясковы сход і паслухаць, чаго хочуць людзі!” Пасля сходу Мікола Павільч кажа: „Ну так, і яны хочуць каб адрамантаваць!”. Першае пачалося ад рамонту вуліцы да пасёлка — да Красноўскіх, Пучынскіх, Саевічаў, Болбатаў. Ужо быў снежань (нас выбіралі на радных у лістападзе), і я званю войту: „Мусім паладзіць дарогу, Красноўскія і іншыя не могуць праехаць — ехаў па малако грузавік з прычэпай, застраг, другі раз з падворка не мог выцягнуць. Мусова зрабіць рамонт дарогі”. — „А пане Янка, а тое, а сёе, а хто, дарэчы, зімой будуе дарогі!” — „Пане войце, але я цяпер не пан Янка, а радны. Сустрэнемся на сесіі, я гэтай тэмы не адпушчу” — „Пане Янка, ніхто не будуе дарогі ў снежні!” — „Вы ўпіраецеся, дык і я буду ўпірацца. Снежань цяпер, але якая тэмпература? 14-15 градусаў. Немагчыма жвіру прывезці і расплянтаваць? Я, пане войце, нават патрабую, каб тыя людзі, што даюць нам столькі малака і добрую сельскую прадукцыю, мелі добры даезд да асфальту, да шашы. І яшчэ, пане войце, наш кавалак гміны занядбаны, значна больш сродкаў ідзе на поўдзень. У Славіка ўжо асфальт нават за клунямі!” Урэшце войт кажа: „Пане Янка, калі да 16 снежня мароз не сцісне, пойдуць машыны”. І мароз не ўзяў. І зрабілі дарогу. Галубоўскі Мікалай жартаваў: „Гэтую дарогу

## *назавем імем Янкі!”*

Скончылі дарогу. Вясной, калі віхура праходзіла, асабліва напрадвесні, на ваяводскую дарогу (ад Бандароў праз Ляўкова на Плянту) навальвалася голле старых таполяў. „Пане войце, так і так” — выступаю на сесіі. Запісваюць. Высылаюць да падляшскага ўпраўлення ваяводскіх дарог. І першага мая рэзалі тыя спарахнелыя старыя таполі. І аж ад Харкевіча, да скрыжавання да Лешукоў аж у Плянту выразалі. Выйшаў я за вёску — што за панарама стала! Тады я заняўся нашым прызабытым, паламаным, з павыбіванымі вокнамі прыпынкам. Часам войт здзіўлены: „Пане Янка, вы нейкія мне байкі расказваеце!”. А праўда: холадна было, хлопцы спалілі на вогнішчы на прыпынку... аконныя рамы ад прыпынку! Нават паліцыя не прыехала. Давялося пра той прынынак на сесіі сказаць. Загадалі аднаму Б., што меў штраф адпрацаваць, рамантаваць прыпынак. Семнаццаць банак фарбы „расходаваў”, а не памаляваў, той што „прыняў”, падпісаў фактуру за рамонт мусіў сам з калегам той рамонт зрабіць. Зрабілі. А калі пабудавалі тратуар, трэба было заняцца снегам. Выпаў снег. Я выйшаў, стаў замятаць снег з тратуара. Іду да суседа. Нашто, кажа, снег адгортваць. Заходжу да Казлоўскага: „Трэба ходнік замятаць”. — „Янка, трэба? А хто замятае ходнікі?” — „Я замятаю. Людзі, кожны насупраць сваёй сядзібы. Не забывайце, што маеце тратуар, лавачкі харошыя пад новымі платамі, ну дык як не задбаць пра ходнік?”. Ну добра, пані Лідзія ўзялася за работу. Пайшоў я да „Смагі”. Прыбіраць ходнік? Ні халеры! Але падпаў быў „Смага”, і за пакаранне далі яму ў грамадскім пачыне адрабіць штраф. Пытаецца, ці можна ходнік прыбраць, для ўсяе вёскі нават. „Смага” зрабіў штосьці такое, як той плуг, што цягне яго трактар, з дзюбаком, з другога боку расшыраны. І як ішоў па вуліцы цягнучы гэтае ўстройства, адразу снег сцягваў — на бакі, пад плот. А людзі перад сядзібамі самі прыбіралі. Я нават узнагароду самым старанлівым даваў — бярозавы венік. І паверце мне, тады, калі я быў радным, зімой, калі трэба было ў царкву ісці, не трэба было з ходніка саступацца — так чыста было, ачышчана ад снегу. Ну, не сёлетняй зімой. Людзі зноў пачалі хадзіць асфальтам. Войт ужо на мяне наракаў — што і раз рот адчыняў я на сесіі, свае „байкі” распавядаў, свае прапановы выносіў, як тую пра мову меншасці. Цяпер магу голас узяць, але на канец сесіі, у „вольных прапановах”, тады калі ўжо... разбор шапак. Але цяпер, віншуючы мяне з выбарам на солтыса, войт падзякаваў мне за супрацоўніцтва і сказаў што хацеў бы мець больш такіх „заўзятых” у гміне. Цешуся, сказаў, што зноў мае такога супрацоўніка з такім „zacięciem”. „А будзеце мяне зноў дапускаць да голасу? — пытаюся. — Зноў маем справы. Трэба нам рабіць нашыя грунтавыя дарогі”. А маем тут такія тры дарогі. Прынамсі, каб за гэтыя чатыры гады маіх паўнамоцтваў зрабіць дарогу да Барыса на хутар, у той бок каля могільніка; другая па мяжы нашага салэцтва ідзе да Скепкаў (там жыве Аляксандр, Галенка, Эва Дзеніс). Можа не на ўсёй даўжыні, у месцах, дзе пазападалася, дзе выбоі страшэнныя, дзе ямы.

— Я надалей аптыміст. Будзе ўсё зроблена. Раскладзена ў часе, бо нельга таксама так і перад іншымі рвацца. Каб мае выбарцы былі радыя, што мяне выбралі. Хачу, каб наш салэцкі фонд забралі ўжо з гміны. Мы яшчэ як радныя рашылі, каб не разбіваць фонду на паасобныя вёскі, каб распараджалася ім гміна. Ужо ў наступным годзе хочам узяць свае грошы ў наша распараджэнне. Сяляне ўжо ведаюць, на што той фонд прызначыць (гэта невялікія сродкі, недзе каля 10 тысяч, за іх няшмат зробіш), і салэцкая рада падказвае, — купіць самаходны ротар, што змятае снег. Ведаюць, дзе тое купіць, колькі яно каштуе, грошай хапіла б, і яшчэ засталося б. Хай вёска мела б. І мелі б мы зіму „з галавы” на цэлую вёску. Яно і летам ці восенню не стаяла б — змятае пясок, лісце. Жыхароў у нас яшчэ нямала. Дарэчы, задум у мяне ў галаве поўна!

## Вясна над Семяноўкай

Семяноўскае возера з'яўляецца важным прыстанішчам-прытулкам вадаплаўных птушак у Польшчы. Даўжыня гэтага вадасховішча ў 11 кіламетраў, шырыня — 4,5 км ды сярэдняя глыбіня — 3,5 м. Вакол возера знаходзяцца лугі і пашы, а ў некаторых месцах да яго прымыкаюць лясы Белавежскай пушчы.

Зараз ранняй вясной на берагах Семяноўскага возера ўтвараюцца поймы і набірае тэмп птушынае жыццё. Там дзе ўжо злез снег, паявіліся чародкі шматлікіх відаў птушак, такіх як белалобая гусь, крыжаванка, цыраначка, свістун і шылахвостка. Прыляцелі лугавыя шчабятухі і трысняговыя стрынаткі.

Калі пад цёплымі промнямі сонца і цёплымі подыхамі ветру растане лёд, тады прыляцяць сюды і двухчубыя чомгі. Чайкі рыхтуюцца да гнездавання на тутэйшых астравах. Можна выгледзець стрыжа, чорнавалённіка, ружовага пелікана і чырванаватую ластаўку.

Зараснікі на берагах возера займаюць рэмізы, цытрынавыя пліскі і варакушкі. А вільготныя і падмоклыя тэрыторыі вакол вадасховішча выбралі для пасялення лебедзі-клікуны, бугайчыкі, данліны (чарназобікі), малыя і азёрныя кнігаўкі ды сіваваронкі.

Па гарачых слядах

## Дзе горад, а дзе вёска?

Мяжа паміж вёскай Дубіны (Гайнаўскай гміны) і горадам Гайнаўкай відавочна пралягла на маставой рухлівай дарогі. У Дубінах асфальт няроўны і ўхабісты (вельмі многа трэшчын і ямак). А вось уязджаем у горад за дарожнай табліцай з надпісам „Гайнаўка" і коцімся па роўнай як верх стала асфальтавай маставой.

Неабходна, каб улады Гайнаўскай вясковай гміны супольна з Падляшскім праўленнем ваяводскіх дарог у Беластоку адрамантавалі маставую вуліцы ў вялікай вёсцы Дубіны. Дарога ж праз Дубіны з'яўляецца ваяводскай!

**(яц)**

## Ольштын беларускім студэнтам

Адказваючы на заклік Барбары Кудрыцкай, міністр навукі і вышэйшай адукацыі Польшчы, рэктар Вармінска-Мазурскага ўніверсітэта прафесар Юзэф Гурневіч паведаміў, што студэнты, выдвараныя беларускімі ўладамі з тамашніх вучэльняў, атрымаюць магчымасць працягваць навуку ў ВМУ з пачатку новага акадэмічнага года на любой з пяцідзесяці трох спецыяльнасцей, якія прапануе ольштынскі ўніверсітэт. Студэнты з Беларусі могуць пакарыстацца індывідуальным ходам навучання, ім будзе таксама падоўжаны перыяд семестральных залікаў. Яны змогуць працягваць навуку на тых саміх курсах і спецыяльнасцях, што і раней у Беларусі. Дастаткова ім прадставіць дакумент прыёму на дасюлешнюю вучэльню альбо тамашні індэкс. Мяркуецца, што за апазіцыйную дзейнасць рэжым Аляксандра Лукашэнкі адлічыў з беларускіх вучэльняў сама менш некалькі дзесяткаў студэнтаў.

**Андрэй ГАЎРЫЛЮК**

**На апошніх самаўрадавых выбарах за пасаду войта Нарваўскай гміны змагаліся ажно чатыры кандыдаты. У другім туры перамог Андрэй ПЛЯСКОВІЧ.**

# У БУДУЧЫНЮ З БЕЛАРУСКАСЦЮ

Фота Аляксея МАРОЗА

***— Кожны з кандыдатаў на войта спатыкаўся з выбарцамі і слухаў іх прапаноў. Якія былі спадзяванні Вашых выбарцаў і як намерваецеся задаволіць іх?***

— На перадвыбарчыя спатканні са мной прыходзіла многа жыхароў, якія раілі накіраваць інвестыцыі ў акрэслены напрамак — на мадэрнізацыю дарог. Аднак у 2011 годзе трэба будзе завяршыць распачатыя раней інвестыцыі, рэалізаваць тыя задумы, на якія атрымалі мы сродкі і змагацца за датацыі на падрыхтаваныя раней праекты. У бліжэйшым часе будзем пракладаць водаправод Гайдукоўшчына — Цімахі — Рыбакі. Распачалі мы ўжо рамантаваць святліцы ў Ласінцы, Крыўцы і Тыневічах, а хутка пачнем рамонт святліцы ў Трасцянцы. Зараз камплектуем дакументы і хутка распачнем распрацоўку дакументацыі на тэрмамадэрнізацыю школьнага будынка ў Нарве. Хочам падаць заяўку на вонкавыя сродкі для гэтай інвестыцыі разам з самаўрадамі Нараўчанскай гміны і горада Гайнаўкі. На падставе аўдыту прадбачваем, што ўстаноўка новых вокнаў і ўцяпленне школьнага будынка ў Нарве будзе каштаваць каля 1 мільёна 70 тысяч злотых. Хочам таксама падрыхтаваць дакументацыю і старацца ў наступным годзе атрымаць сродкі на будову спартыўнага комплексу „Орлік" каля школы ў Нарве.

***— Аднак Вы сказалі, што пасля будзеце ў першую чаргу мадэрнізаваць дарогі.***

— Зараз вяскоўцы штораз часцей купляюць машыны і патрабуюць у першую чаргу мадэрнізаваць дарогі. Падобныя патрабаванні маюцца таксама ў самой Нарве. Я буду прасіць радных, каб не раздрабняліся на меншыя інвестыцыі і згадзіліся як найбольш сродкаў накіраваць на мадэрнізацыю нашых гмінных і павятовых дарог, на якія неабходна пакласці бітумную эмульсію, бо мы не ў змозе зрабіць там больш якаснага асфальтавага пакрыцця. Якраз у нас складана гэта рабіць, бо ў нашай гміне самая вялікая колькасць вёсак у параўнанні з іншымі гмінамі Гайнаўскага павета. На 48 вёсак ажно ў 17 сёлах няма на вуліцах бітумнай эмульсіі, а ў выпадку 8 сёл няма ў іх ні асфальтавага палатна, ні даезду да іх па дарогах, на якіх ляжала б бітумная эмульсія. У гэтым годзе мы плануем мадэрнізаваць дарогі ў вёсках Кавэла, Навіны і 1 кіламетр павятовай дазной дарогі ў Адрынкі. Калі ў Гайнаўскім старастве знойдуць сродкі і мы знойдзем грошы, каб да іх далажыць, хацелі б таксама завяршыць мадэрнізацыю павятовай дарогі ў Пухлах. У выпадку павятовых дарог мы найчасцей дакладваем да іх мадэрнізацыі столькі ж сродкаў, колькі выдаткоўвае на іх Павятовая ўправа дарог. Распрацаваная ўжо дакументацыя мадэрнізацыі вуліц Міцкевіча, Белавежскай і Жаромскага ў Нарве. Прыблізны кошт выканання гэтых задум складзе 3 мільёны 809 тысяч злотых, а сродкі, якія мы ў сёлетнім годзе можам выдзеліць з нашага бюджэту на ўсе інвестыцыі ў гміне, гэта 700 тысяч злотых. Таму мы і вымушаны шукаць грошай для інвестыцый па-за бюджэтам. Маем намер пісаць праекты перш за ўсё на дафінансаванне дарожных інвестыцый з еўрасаюзнага бюджэту.

***— Кандыдаты на радных балаціраваліся з многіх выбарчых камітэтаў. Ці ўдалося Вам стварыць у радзе кааліцыю, на якую будзеце маглі разлічваць у час стратэгічных галасаванняў, напрыклад, у справах вылучэння сродкаў на мадэрнізацыю дарог?***

— Я ўжо 15 гадоў працую ў самаўрадах і не з'яўляюся прыхільнікам стварання кааліцыі, толькі супрацоўніцтва з усімі раднымі. Мае веды ў справе гмінных фінансаў і магчымасцей інвеставання буду пераказваць радным і маю надзею, што радныя схочуць у першую чаргу вырашаць справы вельмі важныя і важныя, а адтэрміноўваць тыя, што могуць яшчэ пачакаць. Лічу, што ў першую чаргу трэба займацца дарогамі, дарогамі і яшчэ раз дарогамі. Я ўпэўнены, што будзем з раднымі даходзіць да супольных станоўчых вырашэнняў у справе інвеставання і іншых важных спраў.

***— У Нарве працуе вялікая вытворчая суполка „Пронар". Як гэтае прадпрыемства і іншыя суполкі ўплываюць на рынак працы ў Нарве?***

— Практычна ўсе мужчыны ахвотныя да сталай фізічнай працы знаходзяць занятак у „Пронары". У гэтай суполцы знаходзяць работу таксама маладыя людзі з вышэйшай тэхнічнай адукацыяй. Зараз наглядаецца беспрацоўе ў гміне сярод людзей з вышэйшай гуманітарнай адукацыяй, але і частка іх знаходзіць работу ў „Пронары".

***— Перад тым, як дырэктарам Гміннага асяродка культуры стала Тамара Юшкевіч, Вы сем гадоў кіравалі гэтай установай і ведаеце гмінныя патрэбы і магчымасці ў сферы культуры. Якія ў Вас планы ў галіне беларускай культуры ў гміне?***

— Надалей будзем ладзіць беларускія мерапрыемствы, якія апошнім часам арганізавала дырэктар Тамара Юшкевіч. Важнымі з'яўляюцца мерапрыемствы, у якіх галоўнымі акцёрамі выступаюць жыхары нашай гміны, нашы калектывы і вучні, якіх удала рыхтуюць настаўніцы, асабліва настаўніца беларускай мовы Ніна Абрамюк. Практычна кожнае мерапрыемства ў нашай гміне складаюць выступленні з беларускімі песнямі, прытым выконваныя на высокім узроўні. У нашай гміне маецца запатрабаванне на беларускую песню і беларускую культуру. З канкрэтнымі новымі ініцыятывамі будзе выступаць дырэктар ГАК Тамара Юшкевіч. Прадбачваем таксама прамаваць нашую беларускую культуру ў Польшчы і гэта вельмі ўдала робіць вядомы не толькі ў нас калектыў „Рамонка" з Ласінкі.

***— Вы вядомыя на Гайнаўшчыне і далёка па-за яе межамі тым, што вельмі актыўна займаліся спортам.***

— Я спортам і зараз займаюся крыху больш, чым па-аматарску. Ёсць мне чым пахваліцца ў гэтай галіне. У мінулым годзе ў катэгорыі олдбой я на Чэмпіянаце Польшчы заняў першыя месцы на дыстанцыях 800 і 1500 метраў і з рук Ірэны Шэвінскай атрымаў кашулькі нацыянальнай зборнай Польшчы, а пасля быў прадстаўніком Польшчы на Чэмпіянаце Еўропы, што праходзіў на Венгрыі. Мае сыны таксама займаюцца спортам і я лічу, што рух на свежым паветры, гэта між іншым паправа свайго здароўя і ашчаднасць на лячэнні хвароб. Аднак у нас людзі наогул саромеюцца, каб адзець спартыўны касцюм і крыху пабегаць.

***— Неўзабаве пачнецца агульны перапіс насельніцтва. Што трэба зрабіць, каб нашы людзі не баяліся і не саромеліся назваць сваю нацыянальнасць і родную мову?***

— Не трэба саромецца беларускасці і праваслаўя, бо чалавека не ацэньваюць па тым, на якой мове ён гаворыць, а па яго паводзінах. Я думаю, што людзі, якія саромеюцца сваіх каранёў, гэта так, як бы адмаўляліся ад свайго мінулага. Аб нашым мінулым і складанай нашай гісторыі ў нас мала ведаў. Трэба гаварыць аб гэтым, каб усвядоміць маладым хто яны. У гэтым напрамку многа добрай работы робяць нашы гісторыкі, напрыклад, прафесары Антон і Яўген Мірановічы.

***— У чатырох гмінах Гайнаўскага павета беларуская мова ўведзена ў якасці дапаможнай у кантактах насельніцтва з чыноўнікамі, а ў Арлянскай гміне будуць усталяваны ўказальнікі на польскай і беларускай мовах. Ці Вы не прадбачваеце выкарыстаць магчымасці закону аб нацыянальных меншасцях і ўвесці падобнае ў Нарваўскай гміне?***

— Калі будзе грамадскае запатрабаванне, не будзе праблем, каб увесці гэтыя змены. Зараз у нашай гміне амаль усе працаўнікі, разам з войтам, размаўляюць са старэйшымі людзьмі на сваёй мове, хаця гэта не літаратурная беларуская мова.

***— Дзякую за размову і жадаю поспехаў у Вашай працы.***

**Гутарыў Аляксей МАРОЗ**

# Арлянскія кліматы

Тэкст і фота
Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

**Клуб мастацтва Падляшскай оперы і філармоніі пражыў у апошні час амаль што не наезд кінематаграфістаў-дакументалістаў, родам з Арлянскай зямлі. З гледачамі сустрэліся Юры Каліна і Пётр Нестаровіч, а раней гледачы маглі пабачыць фільмы памерлага Мікалая Нестаровіча. Сустрэчы і паказы праводзіліся ў рамках цыкла „Падляшскія эпізоды". Цэлую тройку творцаў спалучаюць фільмавыя вяртанні да тэм звязаных з месцам адкуль яны родам, хоць у шмат якіх творах кранаюць яны тэматыку вельмі адлеглую ад Орлі і ваколіц, як, напрыклад, у фільме „Парад" („Defilada") са здымкамі Мікалая Нестаровіча — Паўночную Карэю.**

Пётр Нестаровіч

Юры Каліна

Аб Мікалаю Нестаровічу якраз расказваў адзін з фільмаў прадстаўленых у час сустрэчы, пастаўлены яго сынам Пятром: „Паштоўка з неба". Пра — званага сябрамі — Колю, шматгадовага кінаапаратара Польскага тэлебачання і фатографа, памерлага ў 2003 годзе, аўтара больш за трохсот дакументальных фільмаў, расказваюць тут жыхары роднай вёскі, м.інш. калега па школьнай парце, а таксама ўласнік бара, якому рэжысёр слаў паштоўкі са шматлікіх падарожжаў па ўсім свеце. Ёсць успаміны з яго юнацкага захаплення фатаграфіяй. Героі фільма расказваюць, што прыезд аператара ў родную Орлю заўсёды быў вялікай падзеяй. Яны ганарыліся сваім земляком і захапляліся здымкамі, якія рабіў у фільмах такіх выдатных рэжысёраў дакументальнага кіно, як Тамара Саланевіч (родам з Нараўкі; хросная маці Пятра Нестаровіча), Анджэй Фідык, Эва Бажэнцкая ці Вальдэмар Карват.

— Калі мой бацька жыў, арганізаваў у Орлі паказы, прымяняючы праектар, і спрашаў знаёмых, — успамінаў Пётр Нестаровіч у беластоцкім Клубе мастацтва. — Бацька не шукаў вялікага свету, вялікага кінематографа. Проста — рабіў сваё. Выпадкова трапіў у тэлебачанне і тут яго ацанілі. Пачаткі яго працы гэта пералом шасцідзесятых і сямідзесятых гадоў. Важкім момантам быў для яго выезд у Маскву як аператара Польскага тэлебачання. Удалося яму туды паехаць, паколькі абодва ранейшыя аператары пісалі даносы адзін на аднаго і цэнтральнае тэлебачанне рашыла іх пазбыцца. Толькі ў Маскве Мікалай Нестаровіч штудзіраваў кінамастацтва.

Дадаў:

— У фільмавым свеце вельмі важнай для бацькі была асабліва пара рэжысёраў: Анджэй Фідык [рэжысёр „Парада" — М. Х.] і Тамара Саланевіч. Асобы ў творчым сэнсе вельмі адрозныя адна ад аднае, карыстаючыеся іншым спосабам пераказу, іншым яго тэмпам. Тамарыны былі інтуіцыя і духовасць. Дарэчы, сама яна была адухоўленая. Фідык лічыў, што ў Міколы таксама фенаменальныя фільмавая інтуіцыя і шчасце.

Пётр Нестаровіч успамінаў Тамару Саланевіч:

— Паколькі я родам з Беласточчыны, тое, што магу ёй даць ва ўшанаванне, дык далей апісваць прыгажосць гэтай зямлі, гэтых людзей, таго ўсяго, што яна кахала.

І так і ёсць у ягоным фільме (можа будзе яшчэ паказаны ў рамках „Падляшскіх эпізодаў") „Zastygłe łzy" з 2005 года аб жыхарах Бандароў, пакрыўджаных пры пабудове вадасховішча Семяноўка.

— Гэты фільм быў спробай вяртання да тэм, якія кранала Тамара Саланевіч, — пераконваў Пётр Нестаровіч.

Другім фільмам на паказе аматарам Клуба мастацтва была „Ruska Polka", аповесць з Орлі з перспектывы пары дзяцей: праваслаўнай дзяўчынкі і яе каталіцкага калегі.

— Гэта фільм, ад якога мне цяжка адасобіцца, таму што расказвае пра асяроддзе, у якім я выхаваўся, — прызнаўся пасля паказу аўтар.

Тыдзень пасля сустрэчы з Пятром Нестаровічам Клуб мастацтва прымаў дакументаліста Тэлебачання Беласток Юрыя Каліну. Былі паказаны тры ягоныя фільмы з ліку больш за ста, якія ён паставіў. Першы „Od głodu i moru" расказваў пра шаптух.

— Гэты фільм датычыць асоб, якія памятаю з ваколіцы маёй роднай вёскі ў Арлянскай гміне. Бабкі-шаптухі выконвалі ролю вясковага сямейнага лекара. Мяне самога вадзілі да шаптухі ў самой Орлі. Была гэта паўсюдная з'ява, якая сёння занікае. Мне залежала на тым, каб паказаць гэтых жанчын у іх натуральным асяроддзі. Не былі гэта толькі жанчыны. У маёй вёсцы быў шаптух — дзядзька Віктар.

Адзначыў:

— Я да гэтай з'явы [аздараўляння шаптухамі — М. Х.] не адношуся. Калі я рэалізаваў гэты фільм [канец рэалізацыі 2000 г. — М. Х.] палічыў, што трэба яе проста дакументаваць, бо ўжо сёння было б з гэтым цяжка.

Іншы фільм Юрыя Каліны „Місія", пастаўлены чатыры гады таму, распавядае пра гісторыю каталіцкага місіянера айца Паўла Дыля, які працуе ў адным з рэгіёнаў Грузіі і разам з іншымі місіянерамі вядзе там цэнтр дапамогі калекам.

— Мы былі ў шоку, прыехаўшы першы раз у Грузію. Дарогі нават не нагадвалі бруку. Бяда ў той час была паўсюдная, асабліва на правінцыі. Усюды былі руіны: і ў вёсцы, і ў горадзе. Гэта прыгнятала. Аднак грузіны аддавалі нам усё, што мелі: і сэрца, і душу.

Трэці з фільмаў Юрыя Каліны ў рамках цыкла „Падляшскія эпізоды" меў загаловак „Шанц на новае жыццё". Быў пастаўлены для Тэлебачання Белсат. Гэта расказ пра ўзнікненне і перыпетыі пратэстанцкай абшчыны ў Мінску, якая абараняла сваю сядзібу ў былой аборы, прымяняючы нават галадоўку.

— Мабыць, гэтую абшчыну можна назваць сектай. Пасля развалу СССР узнікла на постсавецкай тэрыторыі вельмі шмат дзіўных грамадска-рэлігійных рухаў. Гэты касцёл з'яўляецца аўтарскім праектам пастара, які назваў сябе біскупам, — расказваў рэжысёр. — Гэты касцёл існуе надалей. Прайграў ён каля трыццаці судовых разбораў і атрымаў некалькі загадаў эксмісіі. Аднак трымаецца. Можа таму, што ўся справа датычыць касцёла. Зацікавіла мяне пазіцыя гэтых людзей, абараняючых тое, у што вераць. Толькі добра аб іх сведчыць тое, што прымаюць людзей адкінутых, алкаголікаў ці злачынцаў.

Адна з гераінь фільма ў час галадоўкі ў 2006 г. кажа ў камеру:

— Гэта няпраўда, што ў Беларусі ёсць свабода веравызнання.

У час сустрэчы з Юрыем Калінам адна глядачка сказала:

— Вашы фільмы прыгожыя, гавораць пра праўду жыцця.

Юры Каліна:

— Цікавяць мяне жывыя кліматы, людзі з сапраўднымі праблемамі, асабліва ў крайніх сітуацыях.

Сустрэчы Клуба мастацтва Падляшскай Оперы і філармоніі адбыліся м.інш дзякуючы Польскаму інстытуту кінамастацтва.

## Вынікі Алімпіяды беларускай мовы

На XVII Алімпіядзе беларускай мовы першае месца заняла **Марта Бялеўская** (Гайнаўскі белліцэй), на другім месцы апынуліся **Павел Шэшка** (Бельскі белліцэй) і **Пётр Герасімюк** (Гайнаўскі белліцэй), а трэцяе месца занялі **Паўля Шыманюк** (Гайнаўскі белліцэй), **Ева Шкода** і **Тамаш Ляўчук** (абое Бельскі белліцэй). Усе гэтыя асобы сталі лаўрэатамі алімпіяды, а іншыя ўдзельнікі цэнтральных элімінацый могуць карыстацца прывілеямі фіналістаў алімпіяды.

**А. М.**

## У Чаромсе свята

5 сакавіка, субота. На стаянцы побач цэнтра культуры ў Чаромсе шмат аўтамабіляў, ровараў. Ладзіцца імпрэза. Польскі саюз пенсіянераў і інвалідаў арганізуе святочны вечар з нагоды Міжнароднага дня жанчын і... запусты. Даўнейшая традыцыя адзначання гэтых падзей захавалася ў Чаромсе па сённяшні дзень. Калісьці Масленіцу на вёсках адзначала не толькі моладзь, але і старэйшае пакаленне. Жанчыны неслі закуску, мужыкі — гарэлку. Хлопцы наймалі музыкантаў. Калі спрыяла надвор'е, арганізавалі куліг (катанне на санях). На пачастунак збіраліся ў хаце дзяўчыны, у якой была „вялікая" кватэра. Пасля былі танцы. Гулялі або ў святліцы, або на прыватнай кватэры да позняй ночы...

А як сёлета святкавалі чаромхаўскія пенсіянеры?...

Калі я заглянуў у цэнтр культуры яшчэ да пачатку імпрэзы, зала была бітком набіта. Пад сценамі ўкругавую стаялі багата застаўленыя сталы з ежай і напоямі. Вяндліны з крамы і свайго вырабу, фрукты, пячэнне, вінегрэты, марынаваныя грыбочкі, агурчыкі, студзіна — усё гэта давала вобраз шчодрага пачастунку.

Спачатку з мастацкай часткай выступіла школьная моладзь, затым голас узялі ўдзельнікі застолля. Адну вясёлую кампанію сабралі пенсіянеры з Чаромхі — станцыі і вёскі, Вулькі-Тэрахоўскай, Ставішчаў, Кузавы, Баброўкі, Пагулянкі. Бадзёра, не ленаваўшыся, іграли музыканты з Тапароў (Кляшчэлеўскай гміны). Рэпертуар гурту быў багаты і разнародны. Царыла беларуская музыка і песня, якія перапляталіся з польскімі хітамі шасцідзесятых гадоў, тыпу „Ціха вода" ці „Глэмбока студзенка". Ногі самі рваліся да танца. А ў перапынках несліся песні. Адважныя выступілі на сцэне перад публікай. Да такіх належала Раіса Баярунец, якая выканала „Свадьбу", „Смуглянку" ды іншыя шлягеры.

Публіка ўзнагародзіла вакалістку бурнымі воплескамі. У калектыўным спяванні вылучыліся жанчыны з Баброўкі ды Чаромхі-Станцыі, якіх успамагалі мужыкі Андрэй Дубяга, Міша Алексяюк і Мікалай Юхімук. Паколькі ў імпрэзе ўдзельнічаў войт гміны Юрый Шыкула з жонкаю Тамарай, у іх адрас паступілі віншаванні ад публікі. Ініцыятарам і запявалам была Лідзія Зіневіч з Чаромхі-Станцыі. Усе разам праспявалі ім „Сто лят" і „Многае лета".

Не ведаю як закончылася забава, бо я пакідаў кампанію ў поўным разгары каля пятай вечара. Ад'язджаў я дамоў поўны добрых уражанняў з надзеяй, што неўзабаве зноў спаткаемся ў дружнай сям'і пенсіянераў на чарговай імпрэзе.

**Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

# зорка

для дзяцей і моладзі

# А куды едзе рыцар?

Першы дзень вясны ў Гарадку прывітаюць беларускімі вершыкамі з цыкла *Жывінкі з глыбінкі*. Вясну тут сустракаюць ужо ад пачатку сакавіка. Нядаўна дзеці згулялі каляровую і смачную Масленку. Былі масленічныя гульні, смачныя бліны і аладкі.

На прыход вясны гатовая ўжо зала беларускай мовы. Клас *аж смяецца* ад сонечных і квяцістых дэкораў. На насценнай газеце шыбуюць жаўранкі ў шапачках, лётае бусел-клекатун, выпаўз з цёплай зямлі зялёны слімак (мы гаварылі таксама пра камп'ютарнага @ слімака!), прыляцела ластаўка — сімвал шчасця. І дзеці таксама настроіліся сустракаць вясну. Я не паспела прывітацца, калі дзяўчаткі з другога класа спыталі мяне:

— *А што трэба рабіць, каб у жыцці быць чарадзейкай?*

Адказ на пытанне просты. Каб стаць добрай чарадзейкай (а не злой чараўніцай!) трэба вывучаць родную мову, пазнаваць легенды, песні, казкі, абрады. І вучыцца гісторыі сваёй сям'і, мястэчка, краіны...

У класе насценная газетка з бел-чырвона-белым сцягам і гербам Пагоня. Разам з дзеткамі мы адшукалі ў календары „Нівы" Свята незалежнасці Беларусі, якое адзначаем 25 сакавіка. І вось фантазію хлапцоў распаліў рыцар на гербе.

— *А куды ён едзе?* — спыталі яны пра вершніка на кані.

Да гэтай пары ніхто не адказаў на такое пытанне, таму мы маем права заклікаць легенду на наш панадворак. Даўно-даўно ў Гарадку жылі слаўныя рыцары Аляксандр і Рыгор Хадкевічы (іх імёнамі названая галоўная вуліца ў мястэчку). Рыцары жылі ў крэпасці, якая знаходзілася на ўзгорку за мястэчкам. Гэтае месца яшчэ сёння называюць *Замкам*. Яны часта выязджалі на вайну абараняць сваю зямлю ад ворагаў. З гэтага роду выводзіцца таксама вялікі гетман Ян Караль Хадкевіч, які перамог шведаў у бітве пад Кірхгольмам. Цікава што нашчадкам Хадкевічаў з'яўляецца цяперашні прэзідэнт Польшчы Браніслаў Камароўскі.

Але вернемся да 25 сакавіка. У гэты дзень нашыя далёкія продкі, яшчэ да таго як у свеце з'явіліся рыцары, адзначалі Новы год. Свята спалучалася з прыходам вясны, таму гэты дзень заўсёды быў напоўнены песнямі, карагодамі і надзеяй на добры год.

А як у Гарадку сёння адсвяткуюць дату? Каб парадаваць людзей, напярэдадні Свята Волі, 24 сакавіка ў мястэчка прыедзе беластоцкая моладзь з беларускім спектаклем *Ой даўно, даўно*.

**ЗОРКА**

**Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК**

Артур Вольскі

## Пагоня

**А чые там
дзіва-коні
абганяюць час?
Гэта едзе
ў ззянні-звоне
сонейка да нас.
Конь чырвоны —
пасяродку.
Белыя —
з бакоў.**

**Скачуць хутка.
Скачуць ходка.
Іскры з-пад падкоў.
Рыцар
побач з імі ў гонцы.
Меч,
як звон,
звініць.
Ён ад хмараў
наша сонца
зможа ўбараніць.**

**У Пагоні
скачуць коні
у світальны час.
Гэта едзе
ў ззянні-звоне
сонейка да нас.**

## На Алексея зіма пацея!

**(з народнага календара)**

**30 сакавіка, *Аляксея.*** На канец месяца сакавіка ў народзе гаварылі: „Рыба аб лёд — сані аб плот". Гэта значыла, што людзі адстаўлялі сані і пераходзілі на калёсы. Аляксей лічыўся апекуном рыбаловаў. Наогул мужчыны не пралі і не ткалі, гэтая праца была адведзена жанчынам. Аднак на Аляксея рыбалоў-мужык павінен сам напрасці нітак і сплесці з іх борцік або сетку для лоўлі. Існавала перакананне, што такая прылада, зробленая за адзін дзень, будзе лавіць шмат рыбы.

На рацэ раставалі крыгі і рабіліся разводдзі. Людзі гаварылі: „На Аляксея лёд пайшоў гарою, а рыба лускою".

**ЗОРКА**

## Галерэя ЗОРКІ

Фота Ганны Кандрацюк

**1. Імя і прозвішча:** Соня Ніна Сульжык (ПШ у Гарадку)

**2. Мой любімы прадмет:** матэматыка.

**3. У жыцці хачу стаць:** чарадзейкай! А з нармальных прафесій — археолагам.

**4. У сяброў цаню:** весялосць.

**5. Не люблю:** ружовага колеру.

**6. Па-беларуску размаўляю:** з настаўніцай беларускай мовы.

**7. Кніжка, якая мяне захапіла:** «Бясконцая гісторыя» Міхаэля Эндэ.

**8. Падабаецца мне музыка:** дынамічная.

**9. Мае ўлюбёныя стравы:** макарона, курыныя ножкі.

**10. Мой любімы спосаб адпачынку:** чытанне.

**11. Калі дарасту хачу жыць:** У лесе. Чаму? А дзе жывуць чарадзейкі?!

# З алімпіяды на сцэну!

Дзень пасля таго, як афіцыйна былі пададзены вынікі прадметнага конкурсу па беларускай мове ў гімназіі, мы сустрэлі трох сёлетніх лаўрэатаў на... тэатральнай сцэне. Яны выступалі ў ліцэі пры Комплексе школ, што па вуліцы Антанюк-Фабрычны ў Беластоку са сваім спектаклем „Ой даўно, даўно". Гэта быў другі выступ на працягу аднаго тыдня. У суботу паедуць яшчэ ў Чыжы. Творчыя паездкі, гурткі і шматтадзінныя рэпетыцыі не адцягнулі іх ад грунтоўнай навукі. Наадварот, прынеслі поспехі ў прадметным конкурсе па роднай мове!

— Я вельмі рады, што ўрэшце стаў лаўрэатам, — прызнаецца Ігар Карнілюк, гімназіст трэцяга класа. — Дзякуючы гэтаму я без перашкод паступлю ў III Агульнаадукацыйны ліцэй.

— Шмат часу ты прысвяціў зубрэнню?

— Найбольш вучыўся да раённага этапу, пасля ўжо менш. І цэлы час думаў ці пашчасціць. І *ўдалося*!

Вольга Мазурук таксама ў трэцім класе гімназіі. Сёлета яе першы поспех у прадметным конкурсе. Оля заваявала максімальную колькасць балаў. Як прызналася, шмат зубрыла, найбольш у час зімовых канікулаў. Хоць да конкурсу рыхтавала настаўніца Іаанна Васілюк, дапамагалі яшчэ бацькі.

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

*Выступаюць (злева) Оля Мазурук, Лідка Пякарская, Юлька Скаўронская, Дар'я Вапа*

— Калі я чагосьці не ведала або мела сумненні, прасіла дапамогі ў мамы. Яна вельмі ахвотна дапамагала, раіла, падказвала. І моцна падтрымоўвала мяне на духу!

Максімальную колькасць балаў набрала таксама Дар'я Вапа. Як не цікава, яна ў першым класе гімназіі (усе нашы сябры — вучні беластоцкай гімназіі № 7, раней яны хадзілі ў ПШ № 4 і ў беларускі садок № 14).

— Ці ты прымала ўдзел яшчэ ў іншых прадметных конкурсах? — пацікавіліся мы.

Дар'я, можна сказаць, ветэранка беларускіх прадметных конкурсаў. Будучы вучаніцай пачатковай школы, яна тры гады запар, пачынаючы з чацвёртага класа, мела званне лаўрэата. А ў шостым класе заваявала яшчэ такое званне па гісторыі ды стала фіналісткай па польскай і нямецкай мовах. Зацікаўленні хоча развіваць ў будучыні:

— У другім і трэцім класе буду вучыцца да алімпіяды па іншых прадметах, — прызналася нам Дар'я...

Поспех у прадметным конкурсе па роднай мове гэта таксама гонар і радасць бацькам.

— А твой бацька неяк падштурхоўваў цябе, заахвочваў прымаць удзел у алімпіядзе па беларускай мове? — пацікавіліся мы.

— Бацька крыху мне дапамог, часам мы гаварылі пра літаратурныя творы. Сам конкурс паказаўся мне просты, нават лягчэйшы, чым у пачатковай школе. А калі ідзе пра ўдзел у конкурсе — ніхто мяне не намаўляў, не заахвочваў. Гэта мой выбар.

**ЗОРКА**

# Музыка з кайфам

## Ой HVARNA тут, HVARNA

Беларускі старадаўні фальклор мае ў беларускай музыцы не адзін твар. Моцныя, рытмічныя мелодыі былі спецыяльнасцю між іншым гурту „OSIMIRA". Як далёка гэта, напрыклад, ад „Тройцы" — не трэба тлумачыць. Паколькі гурт Івана Кірчука працуе паспяхова, то „OSIMIRA", хаця здабыла шмат

папулярнасці, зышла з гэтага шляху, паколькі жыццёвы шлях памяняў лідар гурту Андрусь Палаўчэня. З Магілёва пераехаў у Санкт-Пецярбург і...

... і без музыкі не мог жыць, таму заснаваў новы гурт „HVARNA". Калі займаешся фолькам, цяжка ад гэтага адыйці. Не здзіўляе тады, што „HVARNA" ўзяла голас у гэтай галіне музыкі. „OSIMIRA" была вельмі блізка аўтэнтычнага фальклору. У выпадку гурту „HVARNA" бачым зусім новы падыход да этна-музыкі. Амб'ент-фольк ці этна-транс — музычныя журналісты ўжо шукаюць адпаведную назву для новага праекта, які інспіруецца музычнай культурай не толькі Беларусі, але і паўночнай Расіі ды вугра-фінскіх народаў.

Дэбютны альбом „Кола вяртання" моцна здзівіў беларускіх слухачоў, а перш за ўсё крытыкаў. У розных рэйтынгах яго ацанілі вельмі высока, хаця б у падвядзенні года на партале „Тузін літоў" ці паводле тых, якія размяркоўваюць прэміі Experty.by. Слоў захаплення не пералічыць, хочацца толькі пачуць гурт ужывую. У музычным энсе асноўвай гучання здаюцца быць клавішы, але настрой малююць іншыя інструменты, сярод якіх пачуем гуслі ці дуду. Адным з найважнейшых інструментаў з'яўляецца людскі голас, а ў гэтым праекце голас мужчынскі спалучаецца з жаночым, ствараючы асобную прастору. Ёсць у гэтым сапраўды многа трансу і цешыць, што беларускі фольк не стаіць у месцы, што ёсць шляхі, па якіх можна крочыць ды знаходзіць новае, а нават лепшае.

Пашукайце гурту „HVARNA" пакуль у інтэрнэце. Хто ведае, можа пры нагодзе нейкай мастацкай падзеі знойдзецца сцэна і арганізатар, які прывязе музыкаў з далёкай Расіі, а мы станем часткай шумнага — *HVARNAга* — шоў.

i_basovka@o2.pl

# Легенда пра бел-чырвона-белы сцяг

*(падляшская версія)*

Пра паходжанне бел-чырвона-белага сцяга паэт і бард Сяржук Сокалаў-Воюш напісаў верш *Легенда пра князя*. Твор спяваюць пад гітару, час ад часу можам пачуць яго ў радыёперадачы *Пад знакам Пагоні* або па *Радыё Рацыя*. Паводле яго наш нацыянальны сцяг узнік у час Грунвальдскай бітвы (10 ліпеня 1410 года). Як не цікава, сцяг нарадзіўся сам па сабе, спантанна, быццам пра яго існаванне вырашылі вышэйшыя сілы. У тыя часы, калі прыйшлося змагацца з крыжакамі, жыў у Беларусі, якую тады называлі Вялікім Княствам Літоўскім, храбры князь. Людзі шанавалі яго за мужнасць і любілі за дабрыню. Калі ўспыхла вайна, князь сабраў сваю дружыну і паехаў ваяваць. У час сечы ён быў паранены ў галаў. Верныя сябры аднеслі яго ў бяспечнае месца і абвязалі палатном акрываўлены лоб. Тым часам на полі бою, калі не хапіла на ім смелага князя, які сваім прыкладам натхняў да чыну, ваяры разгубіліся. Яны пачалі гінуць і адступаць. Здавалася яшчэ крышку і перамогуць ворожыя войскі. Убачыўшы паразу сваёй арміі, князь падняўся на ногі, сарваў павязку з галавы і, як адроджаны, рушыў у бой. У адной руцэ трымаў ён меч, а ў другой — пазначаную сваёй крывёй павязку. Белае палотнішча з крывавай палоскай залунала свабодна на ветры па-над галовамі беларускіх рыцараў. Пад кіраўніцтвам князя дружына быццам акрылілася, ажыла, з новымі сіламі рушыла ў бой. Пасля доўгай яшчэ бітвы беларусы перамаглі крыжакоў.

Гістарычныя звесткі накіроўваюць нашу легенду ў цікавы і знаёмы бок. Вось пад бел-чырвона-белым сцягам змагаўся пад Кірхгольмам у 1605 годзе Ян Караль Хадкевіч, вялікі гетман ВКЛ, нашчадак князёў Хадкевічаў з нашага Гарадка. З бел-чырвона-белым сцяжком ішоў да Паўстання 1863 года Кастусь Каліноўскі, народжаны ў Мастаўлянах на той жа Гарадоччыне. Цяпер у час маладзёвага рок-фестывалю ў гарадоцкім лесе і моладзь гуляе з бел-чырвона-белымі сцягамі. Чаму гэты куточак нашай бацькаўшчыны так прыцягвае вольную нацыянальную сімволіку? А можа гэты адважны князь, пра якога распавядае легенда, быў родам з нашай Беласточчыны?!

pics.livejournal.com

ЗОРКА

# Польска-беларуская крыжаванка № 13

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 9:

Зрок, шаша, твор, бал, век, бульба, ар, кіль, парк, іржа, горла, торт. Тварог, звер, рок, пір, хор, Карл, біржа, булка, шаль, баль, до, ара, кіт.

Узнагароды, запісныя аўтаручкі, выйгралі **Альжбета Сідарук** з Новага Корніна, **Магдалена Ваўранюк, Вікторыя Артэмюк, Магдалена Магрук, Кацярына Дзержаноўская, Мартына Швед, Юліта Данільчук** з Бельска-Падляшскага, **Марта Лемеш, Лукаш Сідарук** з Орлі, **Рафал Вакулюк** з Арэшкава. Віншуем!



# МІКАЛАЙ МЯЖЭННЫ — заслужаны для Гайнаўскага павета

Тэкст і фота Віктара БУРЫ

**Мікалая Мяжэннага — майстра народнай музыкі ведаюць аматары беларускай песні на Беласточчыне і па-за яе межамі. З фальклорным калектывам „Цаглінкі” са Старога Ляўкова скалясіў ён гастрольныя і фестывальныя маршруты па ўсёй Польшчы, Беларусі, Украіне.**

**Яго радзіма — Беларусь. Нарадзіўся Мікалай Мяжэнны 2 студзеня 1950 г. у вёсцы Буды Горацкага раёна Магілёўскай вобласці. Атрымаў вышэйшую адукацыю і ўжо сорак гадоў вядзе педагагічную дзейнасць. Працаваць пачаў акампаніятарам у Горацкім доме піянераў і школьнікаў. Потым лёс закінуў у Гродна, дзе яго жыццё цесна знітавалася з музыкай. Працаваў выкладчыкам агульнаадукацыйнай, затым дырэктарам музычнай школы. З 1997 года працуе выкладчыкам Коледжа мастацтваў у Гродне.**

У 1992 годзе па просьбе Беластоцкага ваяводства, а ў прыватнасці Беларускага грамадска-культурнага таварыства, па ініцыятыве Фонду культуры і на падставе рашэння Гродзенскага аблвыканкама Мікалай Мяжэнны быў накіраваны ў Польшчу для аказання метадычнай і практычнай дапамогі беларускім мастацкім калектывам. Вельмі часта ў складзе журы прымае ўдзел у музычных фестывалях. Апрацаваў вельмі многа аранжыровак для калектываў мастацкай самадзейнасці. З'яўляецца аўтарам многіх песень, якія выконваюць шматлікія калектывы. Вельмі многа дапамагаў у падборцы музычнага рэпертуару для салістаў і гуртоў мастацкай самадзейнасці Падляшша.

З 1993 года Мікалай Мяжэнны ўзначаліў фальклорны гурт „Цаглінкі”, з якім займаецца па сённяшні дзень. У калектыве амаль 20 асоб, як мужчын, так і жанчын. Спяваюць людзі рознага ўзросту і прафесій, ад дваццаці гадоў і вышэй. Рэпертуар у асноўным складаюць беларускія народныя песні. Ёсць польскія, а таксама песні іншых народаў свету. Ідзе праца па збіранні мясцовага фальклору. „Цаглінкі” спяваюць таксама песні беларускіх кампазітараў. Некаторыя песні спевакі складаюць самі з дапамогай мастацкага кіраўніка Мікалая Мяжэннага.

*Злева: Уладзімір Пятрочук, Мікалай Мяжэнны, Мікалай Павільч*

Калі гэты таленавіты спецыяліст пераняў гурт „Цаглінкі” са Старога Ляўкова, пачалася плённая праца на карысць музычна-фальклорнага мастацтва. Поўныя глыбіні і майстэрства былі і ёсць канцэртныя праграмы, падрыхтаваныя разам з членамі гурту. Музыка і песні ў іх выкананні захапляюць публіку паэтычнасцю і асаблівасцю мовы. На базе гурту „Цаглінкі” існуе дзіцячы калектыў, у якім спяваюць дзяўчынкі ва ўзросце 5-14 гадоў. Фальклорны гурт „Цаглінкі” дзейнічае ўжо 35 гадоў. За гэты час даў ён больш за 600 канцэртаў. Геаграфія выступленняў вельмі шырокая. Аб'ехалі з канцэртамі амаль усю Польшчу, выступалі на Украіне, Літве. Часта прэзентаваліся на фестывалях у Беларусі (Пінск, Пружаны, Ружаны і інш.). Не раз удзельнічалі ў фестывалі нацыянальных культур у Гродне. У 2010 г. былі ўдзельнікамі фестывалю „Залессе збірае сяброў” у Беларусі. На працягу многіх гадоў фальклорны гурт „Цаглінкі” паспяхова выступае на фестывалі беларускай песні і свяце беларускай культуры, галоўным арганізатарам якіх выступае Беларускае грамадска-культурнае таварыства. Салісты, дуэты, трыо і сам гурт заўсёды займаюць прызавыя месцы. „Цаглінкі” прадстаўлялі Падляшскае ваяводства на агульнапольскім фестывалі ў Быдгашчы, здабывалі ўзнагароды на аглядах калядных калектываў гміннага, павятовага і ваяводскага ўзроўняў.

Мікалай Мяжэнны — акадэмічны выкладчык, мастацкі кіраўнік „Цаглінак” таксама не раз узнагароджваўся граматамі розных устаноў Рэспублікі Беларусь, між іншым, аблвыканкама і гарвыканкама ў Гродне. У 2004 г. за заслугі ў развіцці культуры атрымаў ганаровую грамату Міністра культуры Польшчы, а за шматгадовую дзейнасць у справе захавання культурнай спадчыны беларускага народа — ганаровую грамату Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь.

Самую апошнюю ўзнагароду Мікалай Мяжэнны атрымаў 25 лютага ў Гайнаўцы. Тады ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы адбылося прысваенне званняў і ўручэнне медалёў „Заслужаны для Гайнаўскага павета”. За заслугі ў культурнай дзейнасці павета медаль Мікалаю Мяжэнному ўручыў стараста Уладзімір Пятрочук. Бляску ўрачыстасці надало выступленне мінулагодняга лаўрэата звання „Заслужаны для Гайнаўскага павета” вядомага опернага спевака Міхала Скепкі. На заканчэнне мастацкай часткі выступіла белліцэйская „Знічка” пад кірункам Бажэны Ляўчук, якая ў гэты вечар таксама атрымала званне і медаль „Заслужаны для Гайнаўскага павета”. Публіку асабліва захапіла песня „Воблакі, воблакі” ў выкананні Дар'і Маркевіч, якая быццам знічка ўпала з неба на ўдзельнікаў урачыстасці.

# *(Не)шчаслівая трынаццатка (2)*

Анатоль ПАРЭМБСКІ

*Адпраўляў у царскую армію Ваньку бацюшка Вінаградаў вельмі ўрачыста, дзякуючы яму за добрую службу, — як казаў, — для дабра Царквы. Пра тое, што Ванька не хацеў ісці вучыцца ў духоўнае вучылішча, бацюшка меркаваў: „Будзеш гэтага шкадаваць усё жыццё!”.*

*Расставанне з роднай хатай у Страшаве з большага забытае. Не мог Ванька толькі забыць мамы і ўсяе радзіны, а таксама сяброў. Прайшло ўжо на службе ў Барыку 13 гадоў. І хоць быў там суровы парадак жыцця, Ванька да яго прывык і пакідаць Барык шкадаваў. Меў і тут добрых сяброў, а найбольш шкадаваў коней, з якімі зжыўся і якія давалі яму заробак. З другога боку — цягнула Ваньку пазнаць шырокі свет, а ехаць у невядомае не баяўся. І так апынуўся Ванька ў Ніжнім Ноўгарадзе над Волгай у палку артылерыі. Прывучаны да дысцыпліны на плябаніі ў Барыку ад дзіцячых гадоў, хутка асвоіўся з нормамі жыцця ў царскай арміі. Ужо да прысягі вылучаўся як добры салдат і даставаў пахвалы. Абслугоўваў двое коней, што цягалі гармату, а паколькі з коньмі было звязана яго жыццё здаўна, дык і тут не было праблем. У далейшай службе Ванька быў наводчыкам і камандуючым гарматай. На трэцім годзе службы ягоную часць наведаў цар Мікалай і ўзнагародзіў м.інш. Ваньку медалём і грашыма. Пасля царскага візіту Ваньку перавялі на службу ў Пецярбург, дзе стаў працаваць у канцылярыі штаба палка. Падчас службы ў арміі Ванька меў добрыя кантакты са святарамі і пасля тэрміну службы вярнуўся на плябанію ў Барык.*

*Пасля нарады ў бацюшкі Вінаградава Ванька стаў на службу ў жандармерыі ў Беластоку, дзе прынялі яго вельмі прыхільна. Неўзабаве Ваньку выслалі ў Пецярбург на курсы, пасля якіх адправілі яго на Пуцілаўскі завод у якасці простага рабочага, з функцыяй тайнага агента. Пачаткова Ваньку працавалася добра. Меў добрую кватэру, пазнаёміўся з добрымі сябрамі, заплату атрымліваў на заводзе і ў жандармерыі, але з бегам часу ўлады сталі папракаць яго, што замала дае ім матэрыялу. Сталі пагражаць паніжэннем зарплаты. Ванька стаў прыкмячаць, што ад яго адхіляюцца сябры. Аднойчы яны паведамілі яму, што вечарам прыйдуць да яго ў госці. Ванька падумаў няладнае, аднак да прыёму гасцей падрыхтаваўся. Калі госці прыйшлі — сябры, з якімі Ванька працаваў за станком — Ванька паставіў закусіць і выпіць. Госці таксама мелі з сабою пачастунак. Пасля добрай выпіўкі адзін з гасцей спытаўся: „Ці ты ведаеш, чаго мы да цябе прыйшлі?”. Вядома, Ванька сказаў, што не ведае. „Ну так, слухай, дарагі Ванька, мы ведаем, чаго ты да нас прыйшоў, а паколькі ты таварыш някепскі і пакуль нікога з нас не прадаў, дык хочам цябе не так папярэдзіць, як сказаць, каб ты хутчэй ад нас адышоў, бо знойдуцца такія, што цябе заб'юць”. Ванька падзякаваў ім за гэта і так разышліся. Раніцай Ванька пайшоў апошні раз на Пуцілаўскі завод.*

*Камендант у жандармерыі, які выслаў быў Ваньку на Пуцілаўскі завод, накрычаў на яго, сказаў, што не здаў ён экзамену перад айчынай і заслугоўвае пакарання ды адправіў дахаты. Праз некалькі дзён камендант паклікаў Ваньку і сказаў, што дае яму месяц водпуску, а пасля падумаюць што з ім зрабіць. Запісаў, дзе будзе прабываць Ванька за той месяц.*

*Прыехаў Ванька ў родную хату ў Страшаве. Мамы даўно ўжо не было ў жывых, браты і сёстры дарослыя, у хаце мачаха з невялікай дзяўчынкай. Хаця хата вялікая, месца там Ваньку не было.*

*Наведаў Ванька бацюшку Вінаградава, якога вазіў быў у царкву з Барыка і які адпраўляў яго ў царскую армію і жандармерыю. Прыняў Ваньку бацюшка вельмі ветліва, ды калі той распавёў, што здарылася, нахмурыўся: „Як я цябе не вучыў, ты, Ванька, усё роўна дурань”. Ванька, вяртаючыся з Барыка, прыпомніў сяброў і зайшоў да жыда Шмуля Шміта. Радасць была вялікая. Шмуль падбадзёрыў Ваньку і сказаў, што для яго знойдзецца і работа, і кватэра. Месяц водпуску мінуў хутка. Не мог Ванька нацешыцца роднай мясцінай і сябрамі з дзяцінства. Прапановай Шмуля пакуль не было патрэбы карыстацца. Меў яшчэ грошы зароблены на Пуцілаўскім заводзе. З бацюшкам больш ужо не спаткаўся. Пад канец водпуску атрымаў Ванька загад з'явіцца ў камендатуру ў Пецярбургу. Там ужо яго чакаў прызыў у армію. Камендант сказаў: „Ты не здаў экзамену ў жандармерыі, затое будзеш вельмі прыдатны ў арміі, а можа і на вайне, страляць з гарматы ўмееш добра” і даў зразумець, што ў армію, калі не будзе вайны, ідзе Ванька на нейкі час. Можна было скеміць, што гэта было пакаранне.*

*Быў чэрвень 1914 года.*

*(працяг будзе)*

# Беларусь у маіх вачах

Юрка БУЙНЮК

Фота з архіва „Нівы”

**У сваёй творчасці я заўжды пазбягаў палітыкі. Думаў, што голас маёй скромнай асобы няважны ў сённяшнім беларускім рацыянальным свеце, бо хто ж зараз слухае паэтаў, асабліва тых наймалодшых. Аднак апошнія падзеі ў Беларусі мяне моцна абурылі. Гэта ж у ніякай еўрапейскай краіне так не дзеецца як у Беларусі, калі па загадзе прэзідэнта збіваюцца маладыя жанчыны, калі ў арышце трымаюцца многія людзі свету культуры. Той, хто думае, што ў Беларусі цудоўна жывецца, вельмі памыляецца. Я шмат разоў пабываў у Беларусі і з паездак вяртаўся ні то абражаны на жыхароў Беларусі, ні то заклапочаны тым, у якім напрамку ідзе краіна, на мове якой думаю і пішу свае творы.**

Абражаны я быў на тое, што большасці беларусам напляваць на тое, што мы, беларусы Беласточчыны, актыўна дзейнічаем, выдаем беларускія кнігі, маем сваё беларускае радыё і тэлебачанне, беларускія газеты ды грамадскія арганізацыі. Для іх мы застаемся палякамі і не паможа ніякае ўсведамлянне, што нам — родная беларуская культура ды беларуская літаратура, на якой выхаваліся мае дзяды, бацькі, што любоў да беларушчыны мы ўвассалі з малаком нашых матуль. На маё пытанне, што якія ж з вас беларусы калі „разговариваете по-русски”, яны тлумачылі, што „наш родной это русский язык, но мы настоящие белорусы”. Для мяне гэта была чужая краіна, таксама як я чужы для тых людзей, якія звалі мяне палякам. Перад першай сваёй паездкай у Мінск у 2002 годзе я бачыў ідэальны вобраз Беларусі з перспектывы майго прыгожага ўяўлення беларускага літаратурнага свету, які я вынес з прачытаных мною твораў класікаў беларускай літаратуры, якую „настоящие белорусы из Белоруссии” лічаць польскай літаратурай.

Хвалявала мяне тое, што беларускія пісьменнікі з Брэста называлі мяне самым „лучшим другом-поляком”. Адзін з тых цудоўных беларускіх паэтаў сказаў мне: „Хлопчык, чаму ты не пішаш на польскай мове? Ты ж быў бы вядомым польскім паэтам!”. Гэтымі словамі мае сардэчныя беларускія сябры-паэты ўсвядомілі мяне, што я ментальна не падыходжу да іх кампаніі, бо я паляк, і напляваць ім на мае вершы і на тое, што я штодзень нават думаю на беларускай мове. Я зусім непатрэбны беларускай літаратуры. Прычынай такога стаўлення беларускіх пісьменнікаў да сваіх калег — прадстаўнікоў беларускай меншасці ў Польшчы з'яўляецца 70-гадовае зняволенне камунізмам, што дало страшэнныя рэзультаты — знішчыла нацыянальную свядомасць беларусаў. А беларусы гэта самы мяккі славянскі народ, які паддаўся і надалей паддаецца масавай русіфікацыі сваёй тоеснасці ды свядомасці.

Пасля распаду СССР быў шанц, каб Беларусь стала нармальнай краінай, дзе паважаецца беларуская мова ды культура. Аднак сталася інакш. Пасля кароткага знаходжання пры ўладзе Шушкевіча, які спрыяў развіццю беларускай культуры, у тым ліку павышэнню статусу беларускай мовы, Беларусь трапіла ў кіпцюры Лукашэнкі, які гадамі знішчае беларускую свядомасць ды мову. Гэта ён прычыніўся да закрыцця апошняга беларускага ліцэя, а таксама збудаваў у свядомасці жыхароў Беларусі стэрэатып беларускай мовы як сялянскай, якой трэба саромецца ды ёю пагарджаць, так як гарадскія ўнукі грэбуюць сваёй вясковай бабулькай. Гэта і зараз прычыняецца да слабой пазіцыі беларускай мовы ў Еўропе. Зараз беларуская мова памірае, так як на пачатку XX стагоддзя памерла ірландская мова, пра што распавядае Джэймс Джойс у сваім рамане „Уліс”, які ў асобе галоўнага героя Леапольда Блюма паказаў апошняга з магікан ірландскай нацыянальнай свядомасці, які быў расчараваны паміраннем на яго вачах сваёй роднай ірландскай мовы, якую выцясніла англійская мова.

Як заўважае ў адным са сваіх навуковых артыкулаў праф. Міхал Саевіч, дэкан беларускай філалогіі Люблінскага ўніверсітэта — стэрэатып слабой у нацыянальным, культурным ды гаспадарчым плане краіны знеахвочвае вучняў да вывучання беларускай мовы. Гэта спрычынілася да таго, што ў верасні 2010 года аддзел беларускай філалогіі ў Беластоку перастаў існаваць, бо ніводзін абітурыент не быў зацікаўлены паглыбляннем ведаў пра Беларусь. Нікому з маладых вучняў у Польшчы не імпануе настаўніцкі стэрэатып слабой гаспадарча Беларусі, якая знаходзіцца пад уладай апошняга дыктатара Еўропы, бо такім званнем ахрысцілі Лукашэнку еўрапейскія масмедыі. Гэта не заахвочвае вучняў да вывучання беларускай мовы, а ў тым ліку прызнавання сябе беларусамі.

Калі б Лукашэнка быў разумным прэзідэнтам, то не закрываў бы апошняга беларускага ліцэя, але даваў бы вялікія датацыі на беларускую культуру і тады пазіцыя беларускай мовы была б моцная. Тады беларуская мова не была б горшай ад польскай і была б мовай не толькі літаратуры, але і навукі, тавараабмену, тэхнікі ды іншых галін штодзённага жыцця. Тады на кожным прадукце беларускай вытворчасці не быў бы рускі „состав продуктов”, толькі віднеў беларускамоўны варыянт складу прадуктаў. На электронных прадуктах, якія ішлі б у Беларусь, былі б інструкцыі на беларускай мове. Тады было б шмат працы для беларускіх перакладчыкаў, настаўнікаў беларускай мовы ці дызайнераў. Беларуская мова мела б тады моцную пазіцыю і я, як выпускнік беларускай філалогіі, без праблем мог бы ўладкавацца на добрую працу. Каб беларускі прэзідэнт паважаў беларускую мову, то Беларусь і беларусаў не толькі паважалі б у цэлай Еўропе, але і ва ўсім свеце. Беларусь была б адкрытай краінай на новых людзей, а беларусаў чакалі б у свеце. А самі беларусы ў Польшчы не саромеліся б у час агульнанацыянальнага перапісу насельніцтва заявіць сваю беларускую нацыянальнасць. Калі б Беларусь была багатай краінай, то фінансавала б беларускую меншасць у Польшчы. Тады да беларускай меншасці прызнавалася б прыблізна столькі, колькі акаталічаных празелітаў-беларусаў прызнаецца да польскай нацыянальнасці ў самой Беларусі. Бо проста хавацца за пазуху Польшчы, якая дае месцы вучобы ды вялікія стыпендыі для беларускіх пярэхрыстаў, што адракліся ад роднай мовы і „со полякамі, кохаё Польскэ як родзоно маткэ”.

Адносна маіх паездак. Будучы на Беларусі, адмоўна ўразіла мяне шмат рэчаў. За прыгожа адрамантаванымі раёнамі гарадоў ці добрымі дарогамі крыўся нейкі падазроны парадак і прыгажосць дамоў, стадыёнаў ды комплексаў навучальных устаноў. За гэтым хаваўся стэрэатып, які захоўваюць людзі з Беласточчыны, якія ні разу не былі ў Беларусі і думаюць, што там рай. Маё расчараванне пачыналася ў абменніку валюты, калі з 400 злотых, якія я замяніў на беларускія зайчыкі, засталося мне 340 тысяч рублёў — гэта раўнавартасць польскіх 340 злотых. Тым спосабам страціў я 60 тысяч рублёў, а гэта 60 польскіх злотых. За 60 злотых я ў польскім маркеце купіў бы прадуктаў на некалькі дзён. Затое ў Беларусі за 60 тысяч рублёў не купіў бы я нават кілаграма каўбасы. У Беларусі мясныя прадукты даражэйшыя чымсьці ў Польшчы. „Куча денег, а в них никакого толка” — шчыра адказала жанчына на мой жарт, што ў мяне жмут грошай, за якія амаль нічога не купіш. Безумоўна, Беларусі даўно патрэбная дэвальвацыя грошай, якія з дня на дзень трацяць сваю вартасць.

Самымі таннымі прадуктамі аказаліся алкагольныя напоі ды кнігі і гэта мяне не здзівіла, бо ў Беларусі людзі спажываюць шмат алкаголю. Напрыклад, у нас гарэлку п'юць у маленькіх 100 міліграмавых кілішках, а беларусы п'юць гарэлку з такіх шклянак, як мы п'ем ваду ці сок. Пра заробкі ў Беларусі размаўляў я з многімі людзьмі рознымі па адукацыі. На ўладу наракалі сяляне, якія не могуць прадаць сваіх прадуктаў, бо беларускі рынак заліваюць прадукты з Расіі. Наракалі таксама рабочыя ды ўніверсітэцкія выкладчыкі, што іх заработкі ўтрая меншыя чымсьці ў Польшчы.

Урэшце я папытаў маладых і пазнаў сапраўдную праўду. З беларускімі студэнтамі надалей трымаю кантакт і ў мяне ад іх самыя свежыя навіны. Маладым у беларускіх гарадах цяжка знайсці працу. Мой даўні сябра са студэнцкіх гадоў пасля завяршэння вучобы на двух факультэтах Беластоцкага ўніверсітэта вярнуўся ў родны Мінск. Ажаніўся, але мае праблему, бо ўжо два гады шукае працы і не можа знайсці. Дарэчы, яго жонка таксама беспрацоўная. Маладыя ў Беларусі мараць толькі пра адно — каб Беларусь адкрыла межы і каб яны мелі магчымасць свабодна выехаць на працу за мяжу. Добра толькі тым, хто хоча з горада перасяліцца на вёску. Ім Лукашэнка адразу дае працу ды жыллё на вёсцы. Так сталася з маёй сяброўкай, якая проста з Мінска пераехала ў Віцебскую вобласць, дзе атрымала працу ў раённай газеце ў маленькай вёсачцы. Наконт працы маладым сітуацыя ў Беларусі такая, як у Польшчы за часоў камунізму, калі ўрад пампаваў грошы ў развіццё вёсак, а забываў пра патрэбы гараджан.

Адносна тых, хто думае, што Беларусь — багатая краіна, скажу, што калі б у Беларусі было цудоўна, то маладыя палякі не ездзілі б на працу на захад Еўропы, але ў Беларусь. Дастаткова паглядзець першы канал Беларускага тэлебачання, якое не мае нічога цікавага паказаць сваім гледачам. Апрача марудных палітычных дэбатаў, навін ды расійскіх серыялаў або слабых амерыканскіх баевікоў, у беларускім тэлебачанні няма нічога цікавага. Беларускай мовы таксама не пачуеш ні па радыё, ні ў тэлебачанні, хаця яны вяшчаюць з Беларусі. У канцы 1990-х гадоў у маёй вёсцы можна было прымаць беларускае радыё „Сталіца”, па якім журналісты вяшчалі на прыгожай беларускай мове. Гэтае радыё слухаў я пастаянна да 2002 года, калі для Лукашэнкі не спадабаўся высокі ўзровень гэтага радыё і „Сталіцу” скінуў у ніжні дыяпазон УКХ. Зараз радыё страціла слухачоў, бо вяшчае на рускай мове, а ўзровень яго намнога ніжэйшы ад таго, калі я яго слухаў раней. Цяпер уключыў інтэрнэт, каб паслухаць „Сталіцу” першы ды апошні раз у жыцці. За апошнія дзесяць гадоў Беларусь выпусціла 2-3 беларускамоўныя фільмы, калі ў нас у Польшчы за адзін месяц на экраны ўваходзяць прынамсі 3 новыя польскія фільмы.

Тое ж самае з беларускай поп-музыкай, якая на вельмі нізкім узроўні. Усе таленавітыя кампазітары ды спевакі запісваюць песні на рускай мове таму, што не аплачваецца ім іграць ды спяваць на беларускай мове. Гэта лукашэнкаўская палітыка спрычынілася да таго, што маладыя беларусы ў беларускай культуры ўсё беларускае бачаць як няякаснае і нявартае ўвагі. Тое ж самае з беларускай літаратурай, якая сапхнутая ў андэрграўнд. Лукашэнка здаўна абрэзаў датацыі на выдаванне кніг ды выплату ганарараў для беларускіх пісьменнікаў. Размаўляў я з брэсцкімі ды гродзенскімі пісьменнікамі, якія ад 15 гадоў не выдалі ніводнай кнігі, бо не маюць на гэта фінансавых сродкаў ад беларускай дзяржавы.

Аднак тое, што найбольш забароненае, вельмі добра развіваецца і мае шмат прыхільнікаў сярод маладога пакалення. Гэта я бачыў на кожнай са сваіх аўтарскіх сустрэч, пасля якіх ставалі доўгія чэргі моладзі па кнігу з маім аўтографам. Маладыя людзі з Беларусі цудоўныя і гэта яны захапляюць мяне сваёй свежасцю. Я моцна веру, што гэта ў іх апошняя надзея ў перамену беларускай свядомасці. У апошнім сваім вершы я напісаў, што ў савецкім люстры нацыянальнага стэрэатыпу неадукаваных беларусаў урэшце ўбачым сапраўдны нацыянальны твар Беларусі, а не нянавісць да беларусаў з Польшчы.

Мы, беларусы Беласточчыны, сапраўды шмат робім ды намагаемся паказаць, што мы — беларусы, а не той самы народ, які ў 1946 годзе мардаваў беларусаў Беласточчыны ды ў тым брата майго дзеда, які прапаў ад рук польскай банды за тое, што быў праваслаўным беларусам! Не ведаючы гісторыі Беласточчыны — гісторыя якой цесна звязана з Беларуссю — вы сурова нас ацэньваеце ды лічыце тым самым народам, які акаталічыў Беларусь у XV стагоддзі. Мы ж еднасць, якую раздзяліў ад вас Сталін. Мы — суродзічы, якія найлепш разумеюць вашы нацыянальныя праблемы ды сэрцам паважаюць нашу супольную маці — Беларусь. А гісторыю трэба таксама ведаць як родную мову, бо народ без гісторыі і роднай мовы сорамна зваць свабодным народам!

Васіль САКОЎСКІ

# Мы і нашы суседзі (1)

*Я, як відаць і большасць з нас, сачу за нашымі мясцовымі, тутэйшымі падзеямі і ўсім тым, што адбываецца ў нашай краіне. Цікаўлюся таксама як жывуць і як маюцца суседнія нам краіны, пераважна Беларусь, Украіна і Расія. Яны ж нам брацкія краіны і народы. Найбольш цікавіць мяне жыццё і лёс нашага народа ды жыццё і лёсы народаў згаданых краін.*

*Дзяржаўная прапаганда проста наперабой хваліцца, што стан нашай гаспадаркі, а значыць і жыццё нашага народа — маюцца добра. Усе эканамічна-палітычныя працэсы пад кантролем і накіраваны яны ў адзінаправільным напрамку. Ну, проста краіна наша на фоне крызіснай і бязбожнай Еўропы і свету — як аўтарытэтна заяўляюць яны — з'яўляецца „zieloną wyspą". І, здавалася б, астаецца толькі радавацца нам за нашу зялёную выспу... Але, прыглянуўшыся дакладней, акажацца, што наша зелень нейкая ненатуральная, вялая, штучная. А значыць і жыццё нашага народа даволі вялае. І перспектывы нашы выдаюцца быць вялымі...*

*У чым жа справа? Маем добрае геаграфічнае палажэнне. Маем мора, маем горы, рэкі, урадлівыя землі і прыродныя багацці. Напэўна маем таксама немалую падтрымку з нябёсаў, бо народ наш моцна рэлігійны ды і мае ўжо нямала сваіх уласных святых на Небе. Чаго ж нам яшчэ не хапае? Думаю, толькі разумнай, разважнай гаспадарчай палітыкі!.. (Гэта, канешне, мой прыватны погляд).*

*А вось наша шаноўная суседка — сінявокая Беларусь. Бадай найбольш нешчаслівая з усіх тут названых краін. Яна таксама была шчодра надзеленая Богам, бо і мае някепскае геаграфічнае палажэнне — цэнтр Еўропы. Не мае мора і гор, але мае прыдатныя для сельскай гаспадаркі землі, мае лясы, рэкі і азёры, а гэта заўсёды немалы козыр, і іншыя прыродныя багацці. Праз Беларусь пралягаюць важнейшыя падземныя, наземныя і паветраныя камунікацыі, што дае ёй немалыя фінансавыя і палітычныя карысці. Так што мае яна ўсё неабходнае быць матэрыяльна абяспечанай і тым самым самастойнай і незалежнай дзяржавай. І не толькі з назвы быць Беларуссю.*

*А цяпер давайце зробім кароценькі экскурс у мінулае Беларусі. І трэба тут адразу сказаць, што было яно цяжкім, змрочным. Якія толькі чужаземцы не пабывалі на ёй, якія толькі салдафонскія полчышчы не патапталі зямлю яе, не нішчылі народ яе, яго культуру, рэлігію. Божа мой, чаго толькі не вытваралі з беларусамі чужаземцы. Іх і паланізавалі, і русіфікавалі, і германізавалі, і лацінізавалі, і саветызавалі, і калектывізавалі, і камунізавалі, і атэізавалі, і сам чорт яго ведае як яшчэ іх -ізавалі. Усё гэта пакінула свой чорны след на нацыі.*

*Многія пакаленні беларусаў марылі аб незалежнай Беларусі. Лепшыя сыны змагаліся за яе незалежнасць і часта гінулі або моцна пацярпелі за гэта...*

*Бог злітаваўся над, тады яшчэ бязбожным, беларускім народам — і лагодна, бескрывава падараваў ім незалежную Беларусь. І тут беларусы проста разгубіліся, пазбавіўшыся апекі бацькі і старэйшага брата. І не сталі, як іншыя савецкія народы, хапацца рукамі і нагамі за атрыманую незалежнасць, умацоўваць і бараніць яе. Бягом узводзіць у ранг дзяржаўнай палітыкі сваю нацыянальную мову, традыцыі, культуру, рэлігію. Распрацоўваць, пашыраць і ўзмацняць іх. Заключаць новыя, карысныя для сябе саюзы, дагаворы...*

*Не, такога ў беларусаў не было. Усю сваю энергію і сілы пачалі аддаваць яны рэанімацыі Савецкага Саюза і савецкага ладу. Ажыццявіць іх, канешне, не ўдалося, бо і не магло ўдацца — труп быў надалей мёртвым і штораз мацней смярдзець пачынаў. Толькі час і энергія непатрэбна былі патрачаны. Нарэшце і беларусы гэта зразумелі і пачалі шукаць сваёй уласнай дарогі на далейшае жыццё. Рабілі гэта неяк дзіўна, незразумела, трапляючы з адной крайнасці ў другую. А мо гэта была іх свядома-хітрая палітыка. Бяда, аднак, у тым, што такая палітыка мае кароткія ногі і да нічога добрага не давядзе, апрача ізаляцыі ад знешняга свету. А такая ізаляцыя заўсёды шкодная. Усе адмоўныя аспекты такой палітыкі выразна праявіліся ў час апошніх прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі...*

*Я крытыкую тут не ўсіх беларусаў пагалоўна, а толькі тых, якія былі і знаходзяцца пры ўладзе і вядуць менавіта такую палітыку. Ёсць і іншыя беларусы і гэта да іх будзе належаць будучыня беларускага народа.*

***(працяг будзе)***

**СПАЧУВАННІ**

**Словы шчырага спачування Андрэю Гаўрылюку**

**па прычыне смерці яго брата Філіпа**

**выказваюць супрацоўнікі „Нівы"**

Аднымі з рыс сучаснага беларускага грамадства з'яўляецца яго абыякавасць і расколатасць. Беларусы, зыходзячы з нацыянальных інтарэсаў, не адзіны народ, які не злучаны нейкай адной мэтай, памкненнем, бачаннем жыцця. Гэта яскрава праявілася толькі што прайшоўшай зімой. Нягледзячы на шматгадовае паліванне брудам апазіцыі, па яе закліку на вуліцу выходзяць дзесяткі тысяч чалавек, але калі лідары апазіцыі трапляюць у турму, то нейкага масавага пратэсту не чуваць. З другога боку, тая большасць, якая нібыта задаволена існуючым рэжымам, ніяк не цешыцца чарговай перамогай цяперашняга беларускага правіцеля, больш таго, неяк сароміцца яе.

Але калі для прыхільнікаў Лукашэнкі паняцце грамадскай салідарнасці не з'яўляецца чымсьці значным, бо дастаткова дэлегаваць усе свае памкненні ўладам і чакаць ад іх міласці, то для незадаволеных сітуацыяй без салідарнасці нельга ніяк, паколькі ад гэтага залежыць іх палітычнае існаванне і права на адстойванне ўласнай пазіцыі.

Найбольш прыдатным месцам для праяўлення такой салідарнасці стаў для беларусаў інтэрнэт. Менавіта там магчыма без якой-кольвек небяспекі праяўляць падтрымку з тымі, хто асуджаны лукашэнкаўскай уладай альбо церпіць ад яе, праходзячы праз розныя фізічныя і псіхалагічныя катаванні. Адным з такіх прыкладаў стаў сайт, што нядаўна з'явіўся ў Байнэце і называецца „Дашлі паштоўку палітзэку".

Месціцца даны сайт па адрасе **www.pashtouka.org** і вельмі адрозніваецца ад звычайных вэб-старонак. Тут няма дзялення на тры альбо дзве часткі, няма рубрык і нейкай кантактнай інфармацыі. Але, па ўсім відаць, гэтага і не трэба, бо функцыяй сайта з'яўляецца дасыланне віртуальнай паштоўкі падтрымкі аднаму з некалькіх дзесяткаў палітзняволеных.

Выява сайта змяшчае дзве гарызантальныя стужкі. На верхняй — партрэты палітрэпрэсаваных пасля 19 снежня 2010 года, а на ніжняй — паштоўкі, адну з якіх можна выбраць і даслаць абранаму адрасату.

„Ужо на працягу многіх гадоў мы рэгулярна праводзім кампаніі па адпраўцы паштовак палітвязьням, — кажа ў інтэрв'ю радыё „Свабода" адзін са стваральнікаў сайта Андрэй Кім. — За гэтыя гады тысячы пасланьняў прыйшлі тым, хто арыштаваны ў Беларусі за свае перакананьні. Я сам быў у зьняволеньні і ведаю, наколькі важныя словы падтрымкі. За час адседкі я атрымаў некалькі сотняў такіх паштовак, і кожная зь іх была як глыток сьвежага паветра".

Зыходзячы з яго расповеду, кожны чалавек, дзе б не знаходзіўся, можа з дапамогай гэтага сайта напісаць палітвязню. Адасланая віртуальная паштоўка будзе раздрукаваная і перасланая звычайнай поштай абранаму адрасату. Таму прыняць удзел у такой акцыі салідарнасці можна не толькі з Беларусі, але і адусюль, дзе працуе інтэрнэт.

„Больш за тое, зараз мы працуем над мабільнай вэрсіяй сайту, каб адправіць паштоўку можна было нават па дарозе на працу", — распавядае пра далейшыя планы Андрэй Кім. Па яго словах, зараз беларускім палітвязням найбольш патрэбны цёплыя словы падтрымкі і разумення, што можа цяпер даць кожны з нас. На самай справе гэта і ёсць салідарнасць.

Варта адзначыць, што сайт мае тры моўныя версіі — англійскую, беларускую і рускую.

**Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ**

# С БЕЛАРУСІ ы

**Клуб „Паходня"**

Гісторыка-культурны клуб „Паходня" нядаўна адзначыў чвэрць стагоддзя з часу свайго заснавання. Гэтая асветніцкая арганізацыя стала легендай беларускай найноўшай гісторыі. Менавіта найперш дзякуючы яе дзейнасці пачалі гаварыць пра горад над Нёманам як пра „беларускі Львоў" — памкненне і жаданне, якія, на жаль, не сталі рэальнасцю, якіх не ўдалося ўвасобіць, бо надышлі зусім іншыя часіны. Паўстаўшы ў асяродку Інстытута біяхіміі клуб „Паходня", які арганічна рыфмаваўся са старой назвай горада „Гародня", развіваўся імкліва. Мікола Таранда і Міхась Ткачоў, Зміцер Кісель і Васіль Бязмен, Данута Бічэль і Аркадзь Жукоўскі — кожны з іх зрабіў свой важкі ўнёсак у станаўленне клуба. Можна называць яшчэ іншыя імёны, але пералічаць усіх лідараў і актывістаў зараз не будзем. Тым больш, што многіх ужо няма сярод жывых, а іншыя — далёка. Перафразуючы класіка літаратуры, можна сказаць, што ўсе мы выйшлі з „паходнеўскага шыняля". Для мяне асабіста, дваццацігадовага тады хлопца, што вярнуўся з савецкага войска ў цывільнае жыццё, кожны прыход на пасяджэнне „Паходні" здаваўся сапраўдным святам. А якія цікавыя людзі прыязджалі на сустрэчы з гарадзенцамі — Генадзь Каханоўскі і Мікола Ермаловіч, Кастусь Тарасаў і Валянцін Грыцкевіч, Міхась Чарняўскі і Аляксей Каўка... На пасяджэннях можна было пачуць тое, пра што не гаварылі з універсітэцкіх кафедраў, даведацца гістарычныя факты, якіх яшчэ не было ў кнігах. З дзейнасці пахаднянцаў пачыналіся многія традыцыйныя нацыянальна-асветніцкія акцыі, узніклі палітычныя партыі і іншыя грамадскія суполкі і згуртаванні.

Праз гады разумею, чаму тагачасная „Паходня" ўспрымаецца і зараз надзвычай рамантычна і нават ідэалістычна. Безумоўна, што і тады былі „стукачы" і „наглядальнікі", але колькасць наіўных летуценнікаў з чыстымі і некарыслівымі памкненнямі ў гэтым клубе дамінавала настолькі, што думаецца, нават тыя, хто прыходзіў па заданні гаркама КПБ ці „трэцяга аддзялення" паслухаць і прасачыць „крамолу", прасякаліся гэтай асаблівай атмасферай шчырасці і рабіліся беларускімі патрыётамі. Наўрад ці зараз можна было б згуртаваць такую колькасць энтузіястаў на беларускую талаку па чыстцы рачулкі Гараднічанкі, ці старых гарадскіх могілак, ці на абыход кватэр і збор подпісаў сярод бацькоў за беларускамоўнае школьніцтва. У складзе „Паходні" былі прадстаўнікі старой гарадзенскай інтэлігенцыі, шмат творчых асоб, амбітных людзей. Нехта пасля стаў досыць знакамітым, нехта заможным, нехта згубіўся праз час, хтосьці застаўся нязменным, а хтосьці здрадзіў ідэалам сваёй маладосці.

Канешне, тады мы не разумелі, што перажывалі найлепшы час у гісторыі Беларусі за апошнія трыста гадоў. Мы былі максімалістамі і проста прагнулі рэформ, змен, адраджэння беларускасці ва ўсіх яе праявах. Дыскусійны гісторыка-культурны клуб „Паходня" быў той пляцоўкай, якая дазваляла кшталтаваць сапраўдны патрыятызм, уласную тоеснасць. І спакваля прыходзіла ўсведамленне, што „Мы — Беларусы". Вельмі важна, што „Паходня" не замыкалася ў рамках гарадзенскай прасторы, менавіта яна закладала лучнасць з беларусамі суседніх рэгіёнаў — Беласточчыны і Віленшчыны. „Паходня" ладзіла краязнаўчыя вандроўкі, экалагічныя рэйды, змагалася за вываз ядзерных ракет, выхоўвала беларускамоўных дзетак, праводзіла Купалле, рок-фэсты і навуковыя канферэнцыі...

Клуб „Паходня" зараз фактычна не існуе. Але старая Гародня памятае яе дзейнасць.

**Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ**

Пётр БАЙКО

# Роздумы над фатаграфіяй

Калі жыццё падыходзіць да мяжы, тады штораз часцей азіраемся на сваё прошлае. Успаміны лезуць у галаву самі. Раздумваем пражытае, падводзім яго вынікі. У мяне паявілася яшчэ звычка пераглядаць старыя сямейныя фатаграфіі. Ды і мой, малодшы ад мяне на восем гадоў, брат Славамір апошнім часам гэтым захапіўся. Бывае, што супольна дыскутуем пра падзеі, якія зафіксаваны на фатаграфіях, ну і, зразумела, успамінаем нашых блізкіх. Аднаго дня сцвердзілі мы, што няшмат у нас здымкаў нашых бацькоў з іх маладосці. А хацелася б нам паглядзець як яны выглядалі ў дзяцінстве. Нядаўна даведаліся мы, што наш дваюрадны брат Юрка Бэлзэцкі з Гайнаўкі захоўвае ў сваім сямейным альбоме здымак з нашай бабуляй Тэкляй і яе дзяцьмі, у ліку якіх і наша маці Ніна. Здымак быў зроблены праўдападобна ў 1928 годзе. Юрка, бачачы нашу зацікаўленасць здымкам, выканаў для нас копію. Мой брат вырашыў неадкладна з'ездзіць у Гайнаўку і ўзяць дарагую нам памятку.

Фота з архіва Юркі Бэлзэцкага

Тэкля Семянюк са сваімі дзяцьмі.

На здымку, побач бабулі Тэклі Семянюк, стаіць яе сын Ваня, а наперадзе — дочкі: (злева) Оля, Маня і Ніна. На здымку не хапае яшчэ адной, наймалодшай бабулінай дачкі Веры, дык тады яе яшчэ не было на свеце. Ну і няма нашага дзядулі Панцеляймона Семенюка. Чаму — не ведаем. Ён памёр падчас II сусветнай вайны на сухоты. Яму было толькі 50 гадоў.

Бабуля Тэкля, дзявочае прозвішча — Янюк, паходзіла з вёскі Ціхаволя, што на паўночнай акраіне Белавежскай пушчы. Яе бацька быў так званым аб'ездчыкам у пушчы. Брат Рыгор у сваю чаргу праславіўся тым, што ў 1936 годзе знайшоў у рацэ Нарве каля Ціхаволі чэрап з рогам, прыналежны даўгарогаму зубру. Чэрап трапіў у прыродазнаўчы музей у Белавежы, дзе экспанаваўся да 1999 года. А прозвішча Рыгора „ўсталявалася" ў зубраведчай літаратуры. Рыгор пасля вайны пераехаў у Мінск на Беларусі і працаваў у тамашняй оперы, шыў касцюмы для акцёраў. Дарэчы, яго сястра, а наша бабуля, таксама была здольнай краўчыхай і пасля смерці свайго мужа з шыцця ўтрымоўвала сям'ю.

З дзяцей Тэклі і Панцеляймона жывуць яшчэ дзве дачкі: Оля, якой ужо амаль 90 годаў, і на амаль дзесяць год малодшая ад яе Вера. Яны зараз жывуць у Гайнаўцы. Оля жыве пры сыне Паўле, да якога пераехала на старасць, бо дагэтуль жыла ў Белавежы. Выйшла яна замуж за Мікалая Чапковіча, які спачатку працаваў у тартаку ў Плацічне пад Сувалкамі, а потым з сям'ёй пераехаў у Белавежу і стаў на працу пры высечцы дрэў. Вера выйшла замуж за паляка з-пад Сямятыч, Яна Савіцкага, і стала жыць у Гайнаўцы. І Оля, і Вера ўжо ўдовы. Маня таксама выйшла замуж за паляка, Міхала Бэлзэцкага, спакойнага і працавітага мужчыну недзе з паўночна-заходняй Польшчы, і пераехала жыць у Гайнаўку, дзе яе муж уладкаваўся на працу ў тартаку. Іх ужо абоіх няма сярод жывых. Наша маці Ніна выйшла замуж за мясцовага хлапца, Міхала Байко са Стачка, і перажыла сваё жыццё ў Белавежы, працуючы на раллі. І яны ўжо памерлі. Адзіны сын Тэклі і Панцеляймона, Ваня, падчас II сусветнай вайны трапіў у палон на Украіне. Там пазнаёміўся з дзяўчынай, якая прыносіла яму пад лагер харчы. Пасля вызвалення яны пажаніліся і сталі жыць у сяле Грязное Сумскай вобласці Краснапольскага раёна. Калі мае цёткі аднойчы наведалі свайго брата, не маглі доўгі час выйсці з жаху. У Польшчы ў той час жылося не надта раскошна, але такога ўзроўню жыцця як у брата яны нават прадставіць сябе да гэтага часу не маглі. Вельмі шкадавалі, што брат астаўся жыць на Украіне. Будучы нядрэнным сталяром (талент у гэтай прафесіі атрымаў па бацьку), у Польшчы мог бы жыць прыпяваючы. Вані таксама ўжо няма ў жывых.

Бабуля Тэкля пражыла 84 гады, памерла яшчэ ў сямідзесятыя.

Глядзім разам з братам на дарагую нам фатаграфію і задумваемся над ходам часу. Пра што думала тады наша, яшчэ малалетняя маці, сціскаючы ў руках сваю анучную ляльку? Што сталася з плюшавым сабачкам Молікам, якога дзяўчынкі прынеслі з сабой да фатографа, каб і яго ўвекавечыць? Вядома, на гэтыя пытанні ніколі не атрымаем адказу. Углядаемся на фатаграфію і пранікаем сэрцамі да нашых блізкіх. Некалі ізноў усе будзем разам.

# Адгаданка

1. вялікая нізкая пасудзіна для мыцця бялізны, 2. метамарфоза, трансфармацыя, 3. суправаджаная слязамі моцная жальба, 4. сігнальны паплавок на вадаёме для абазначэння мелі альбо рыбацкай сеці, 5. ліпкае рэчыва для склейвання, 6. дваровыя людзі, слугі памешчыка пры прыгонным праве, 7. паўвостраў на поўначы Чорнага мора, 8. сябра шаха і мата, 9. мангольскі цар, 10. „невясёлы" абласны горад на ўсходзе Украіны, 11. не ява, 12. дзяржава з Кігалі, 13. парны орган зроку, 14. першая калом, другая сакалом, а трэцяя сама ўляціць, 15. ядомы грыб з шырокай белай махнатай шапкай і кароткай тоўстай ножкай (*Lactarius resimus*), 16. кіруе богаслужэннем у мячэці, 17. мужчынскі голас, 18. Іаган Себастыян, нямецкі кампазітар (1685-1750), 19. паводка, 20. польскі ўрачысты танец-шэсце, 21. мангольская пустыня, 22. не ноч, 23. сумесь тлушчу з лекавымі сродкамі, 24. уладальнік млына, 25. назірае за работай машын, 26. спартыўны снарад для гульні ў хакей, гольф.



Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — страфа Казіміра Сваяка.

**(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 8 нумара**

Ас, зяць, лея, лямпа, маска, піск, таўкач, ціс, чума, шчака.

Рашэнне: **Час часам ляціць як птушка, а часам паўзе як слімак.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Яну Рубчэўскаму** з Беластока і **Яну Міхалюку** з Чыжоў.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*
*Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.*
**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Тэхнічны рэдактар:** Адам Паўлоўскі.
**Рэдактар „Зоркі":** Ганна Кандрацюк-Свярубская.

**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк, Янка Целушэцкі.
**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Друкарня**: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
**Prenumerata krajowa**
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.

**Prenumerata z wysyłką za granicę**
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
**Prenumerata w redakcji**
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2011 roku — 52.
**Przesyłka zwykła:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.
**Przesyłka priorytetowa:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 7,20 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
**Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa",**
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

**Nakład**: 1 300 egz.

# 27.03 — 02.04

**(22.03. — 20.04.)** З надыходам вясны ўступяць у цябе новыя сілы. Новыя праблемы стануць па-дзіцячаму простыя. У красавіку атрымаеш адказы на наспелыя пытанні. А каханне акажацца больш трывалым, чым ты спадзяваўся. Толькі не траць многа грошай. Справы вырашай на працы, дома адпачывай, высыпайся.

**(21.04. — 21.05.)** Добра разглядайся, каб не праваронiць лепшага занятку, новай любові. У красавіку праяўляй асаблівую разважлівасць, а і ў каханні рацыянальнасць прыдасца (што важнейшае — моцныя пачуцці ці мімалётная жарсць?). Твая пранікліваcць і асцярожнасць можа табе памагчы зарабіць добрыя грошы.

**(22.05. — 22.06.)** Можаш разлічваць на падтрымку сяброў і радні; з калегамі — па меры неабходнасці. Добры час падмацаваць фінансы пабочным даходам. Лепшыя ўмовы стварай сабе сам, трымай вочы наўкол галавы. Можаш пазбыцца благіх звычак.

**(23.06. — 23.07.)** Зоркі падмацуюць твой унутраны спакой. Зразумееш, чаго хочаш і адчуеш сябе шчаслівым. Ды будзеш схільны да рызыкі, і можа табе гэта шмат каштаваць! У красавіку будзь гатовы да нечаканасцей. У кар'еры часам трэба ісці напралом. Чытай, слухай музыку.

**(24.07. — 23.08.)** Спроба дамінацыі над іншымі і маніпулявання атачэннем удасца табе як ніколі дагэтуль! Могуць, аднак, з-за гэтага паявіцца ворагі. Можаш інвеставаць у мастацтва або нерухомасці. У красавіку аддыхнешся і будзеш цешыцца пладамі сваёй працы.

**(24.08. — 23.09.)** Час цёплых пачуццяў і ўзаемнага зразумення. Знайдзі больш часу для сябе самога. У красавіку не праяўляй лішняй цікаўнасці і не совай нос у чужыя справы, нават калі кіраваць табою будуць добрыя намеры. Магчымыя праблемы ў асабістым жыцці, а нават кароткае расстанне.

**(24.09. — 23.10.)** Асцерагайся няпэўных інтарэсаў, асцярожна падбірай супрацоўнікаў, не ідзі на лады з падазронымі асобамі, а перш за ўсё не пазычай грошай. Можаш аддацца салодкай ленасці. У красавіку пільна сачы за дэталямі, драбязой — ад гэтага шмат залежыць у тваіх справах. Добра арганізуй працоўны час.

**(24.10. — 22.11.)** Будзь вельмі асцярожным, пануй над гневам і злосцю. 27-30.03. асоба, якую ты лічыў блізкай, падломіць твой давер. Таксама ненайлепшы час для здароўя; не перамляйся. У красавіку пойдзе ўсё па тваёй думцы; можа толькі крыху прытрапіцца непаладкаў з грашыма — трэба будзе аплаціць нейкія дакументы, страхоўкі, даўгі. Затое — мноства паклоннікаў!

**(23.11. — 22.12.)** Можаш у апошнія дні сакавіка апынуцца ў пастцы; кожны ход можа пацягнуць за сабою страты. У красавіку перапады ў настрою. Ды энергетычны патэнцыял будзе даволі высокі, і справішся з усімі задумамі і планамі, без рызыкі для здароўя.

**(23.12. — 20.01.)** Станеш перад неабходнасцю цяжкіх выбараў; не бяры ўсяго што зіхаціць за золата. 26-30.03. цікуюць клопаты і складанасці. Некаторыя рашэнні будуць неабходныя, хоць ты хацеў бы іх пазбегнуць. У красавіку падтрымае цябе самаўпэўненасць. Ды трэба будзе развітацца з аджыўшымі ідэямі і пачаць новае.

**(21.01. — 19.02.)** Шмат работы, ды твой высілак не пойдзе ўпустую. У красавіку не паддайся веснавой дэпрэсіі. Рабі ўсё каб падняць свой дух (м.інш. еж многа бялка — мяса, яек, малочнага, бабовых). Самотных Вадалеяў любоў знойдзе сама.

**(20.02. — 21.03.)** Сімпатыя адусюль; знакаміты час на сустрэчы, заручыны, шлюб. 26-30.03. наваляцца на цябе абавязкі; ад лішняга галава табе не разбаліць. У красавіку найбольш прыемнасці ад кампаніі — не толькі адпачнеш-загуляеш, але і справішся з любымі непрыемнасцямі дзякуючы сябрам. Ды поўнасцю давяраў толькі добрым знаёмым!

**Агата АРЛЯНСКАЯ**

Тэкст і фота МАЦЕЯ ХАЛАДОЎСКАГА

# У СВЕЦЕ ВІКТАРА СТАХВЮКА

**Аўтар зборніка вершаў „Багровы цень" і кнігі „Сіва зозуля" Віктар Стахвюк сустрэўся з чытачамі ў рамках цыкла „Літаратурныя серады" ў беластоцкай Падляшскай ксёнжніцы. Народжаны ў 1948 г. у Трасцянцы пісьменнік і паэт займаўся гандлёвымі кантактамі з Беларуссю і Расіяй. У 1988-1992 гадах быў сакратаром Галоўнага праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства. З 1999 г. працуе ў Радыё Рацыя. З'яўляецца выпускніком русістыкі і тэлеінфарматыкі. Сустрэчу пачаў ярказ ад спасылкі на гэтую другую спецыяльнасць:**

— У тэлеінфарматыку я сам укруціўся. Мае тэхнічныя веды аказаліся патрэбнымі, калі мы праектавалі Радыё Рацыя.

Тлумачыў сваю выкладчыцкую працу русіста ў 1975-1988 гадах на адной з вучэльняў у Чанстахове:

— Руская мова была інструментам, без якога ў свеце тэхнікі нельга было нічога зрабіць. Навінкі ў спецыялістычных выданнях былі даступныя толькі на рускай мове.

Віктар Стахвюк дэбютаваў у 1962 г. у „Ніве". Як прызнаўся ў Падляшскай ксёнжніцы — дзякуючы прысутнаму на сустрэчы Віктару Шведу:

— Вершы я пісаў ад заўсёды. Ужо, здаецца, ад нарадзін. У прынцыпе заўсёды ў стол. У нашу пачатковую школу прыехаў быў Віктар Швед. Паказаў я тады яму некаторыя свае вершы. Забраў іх з сабою з тры і пасля апублікаваў у „Зорцы".

Рэцэпт на пісанне паэзіі ў яго просты:

— Хопіць зафіксаваць пару асацыяцый і ўзнікае верш.

Сваё захапленне народнай культурай змясціў у кнізе „Сіва зозуля". Дарэчы, была яна ўжо тэмай ягонай дыпломнай магістарскай працы, прысвечанай яго роднай прынарваўскай вёсцы Трасцянцы. У кнізе — як пісаў гісторык Алег Латышонак у пасляслоўі да яе — фальклор вёскі Трасцянкі паказаны на шырокім фоне Славяншчыны, а ў гістарычным слаі не з'яўляецца яна дакладам дакладна навуковым, а эсэ напісаным з душой паэта. У час сустрэчы аўтар гаварыў:

— Трасцянка распаложана паміж дзвюма рэкамі, калісьці з мноствам багнаў і тарфянікаў. Не былі яны меліяраваныя. Пры лямпах-газоўках людзі перадавалі сабе мноства таямнічых аповедаў, якія над імі ўзніклі. Слухаў я іх, седзячы на печы. І гэта ўсё мяне сфармавала.

І працягваў:

— Сёння ў віртуальным свеце плазмы і камп'ютара няма адкуль браць інспірацыю. На тое нам Гасподзь даў душу, каб мы адрознівалі дабро ад зла. Прыгнятае нас і нявечыць мана, што плыве з тэлебачання.

Спаслаўся таксама на сваё замілаванне да старажытных славян; супраць прымітызавання іх духоўнага свету заўсёды пратэставаў, застаўшыся верным Праваслаўнай царкве:

— Перад праславянскімі жрацамі стаяў выбар: даць веды ўсім, ці пакінуць іх самім сабе. Пакінулі іх сабе.

Успамінаў таксама аб прыгажосці яднання з натурай, прывёўшы хвіліны, калі сам ездзіць на старым трактары і косіць лугі, назіраючы за хаваючайся звярынай.

Не скрываў таго, што падобна як паэзія захапляў яго жывапіс. Паказваў свае працы на выставах у Чанстахове і ў Трнаве:

— Будую цяпер мастацкую майстэрню. Малявання я вучыўся сам. Заўсёды хацеў маляваць. Думаю, што яшчэ буду.

Чытачы мелі нагоду паслухаць фрагментаў новага рамана, са студэнцкага асяроддзя ў 1980 годзе, напрадвесні салідарніцкага зруху. Пакуль напісана каля двухсот старонак кнігі:

— Гэта антыраман, бо няма тут сенсацыйных матываў.

Нявыключана, што ўзнікне ўрэшце другі том кнігі „Сіва зозуля" (2006 г. выдання).

— Гэты другі том мушу напісаць. Хачу паказаць лёс тыповай падляшскай вёскі як часткі беларускага этнасу.

# Студэнты зладзілі Гуканне вясны

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

Гуканне вясны ў мурах універсітэта! — гэта гучыць арыгінальна. Да гэтай пары студэнцкае асяроддзе ладзіла мерапрыемствы тыпу *Французкая вясна* ці *Іспанскія дні культуры*. І вось прыйшоў наш час...

16 сакавіка, серада. Дзверы ва ўніверсітэцкую залу № 47, якую ведаю з-за навуковых сустрэч, яшчэ закрыты. Перад парогам гаманлівая кампанія. Гэта беластоцкія ліцэісты, якіх запрасілі на свята. Чакаюць аж усё будзе ціп-топ і гаспадары запросяць іх усярэдзіну. Гаспадары, студэнты беларусістыкі і русістыкі, крыху старэйшыя за іх магістранткі, наводзяць апошнія парадкі. Калі пераступаю парог, не ведаю што думаць. Першае ўражанне такое: а ці апынулася я ў Памесці Дзеда Мароза? Неяк шакіруе мяне цеплыня дэкору ў гэтым месцы. Ён такі каляровы, казачны. Гляджу на сталы, застаўленыя горбай бліноў, і талеркі з разнавіднай стравай. Колькі энергіі і часу трэба прысвяціць такому рукадзеллю, кулінарыі і мастацкай падрыхтоўцы абрадаў?

Сёння ва ўніверсітэце пакажуць рускую Масленіцу, беларускае Гуканне вясны і польскі Першы дзень вясны. Разам з фільмамі студэнты будуць распавядаць пра абрады, пагукаюць супольна вясну, наладзяць конкурсы і будуць супольна складаць вершаваныя творы. Вясну спачатку гукалі разам, пасля самі ліцэісты, якім магічны беларускі абрад адразу спадабаўся. Усе заклікалі вясну словамі:

*Жаваранчкі прыляціце — у-у-у-у!*
*Вы нам лецейка прынясіце — у-у-у-у!*
*А зімачку забярыце — у-у-у-у!*
*Бо зімачка нам надаела — у-у-у-у!*
*Усе хлебушкі пераела — у-у-у-у!*

Перад гэтым вядучая патлумачыла сэнс самога гукання (у-у-у-у!). Гэты гук меў выклікаць вібрацыю ў паветры і дапамагчы адраджэнню жыцця. Да абраду старанна рыхтаваліся. Хлопцы зносілі ўсе старыя прадметы, ламачча і палілі іх у кастры. Дзяўчаты аздаблялі дрэвы каляровымі стужкамі, краскамі, папяровымі птушачкамі і сваім спевам напаўнялі паветра. У Беластоку яшчэ і частавалі абрадавым печывам: жаўранкамі і галёпкамі, вядомымі ў нас як буслава лапа.

Праграма спадабалася гасцям. Пра радасць ад сутыкнення з чымсьці чароўным і крыху знаёмым сведчылі вершы, якія талакой складалі ліцэісты. Адзін з іх завяршаўся так: *Расія і Беларусь — я вас нікагда не забуду!*

Руска-беларускі характар свята — невыпадковы. Раней падобныя прэзентацыі рыхтавалі адно русісты. Беларуская філалогія ўпершыню выйшла з такой прапановай.

— Мы хацелі паказаць асаблівасці беларускага абраду, — кажа Анна Смактуновіч, студэнтка другога курса беларускай філалогіі, — а таксама заахвоціць вучняў сярэдніх школ, каб паступалі на нашу філалогію.

Арганізатары беларускай часткі, студэнты другога курса і іх выкладчыцы — магістр Аліна Філановіч, магістр Іаанна Васілюк і магістр Анна Грэсь. Гледачамі і ўдзельнікамі конкурсаў былі настаўнікі і вучні першага класа Х Агульнаадукацыйнага ліцэя ў Беластоку, якія вывучаюць рускую мову. Ці звяжуць яны ў будучыні свой лёс з беларускай або рускай мовамі? Пакуль ніхто не ўмеў рашуча адказаць на маё пытанне. Напэўна вялікай нечаканасцю была для іх прэзентацыя беларускага абраду. Пра гэта сведчылі эмоцыі і жывы кантакт паміж сцэнай і залай. Мне самой, калі б на аснове пабачанага, пачутага і пасмакаванага прыйшлося выбіраць між спецыяльнасцямі, я без сумнення рашылася б на беларусістыку. Ды заахвоціла б нашых студэнтаў, каб кожны год рыхтавалі падобныя прэзентацыі ва ўніверсітэце. А яшчэ лепш, калі б з'ездзілі са сваімі прэзентацыямі і галёпкамі ў школы, дзе вучаць беларускай мове.

## Беларускае культурнае таварыства „Хатка"

запрашае
на 93 угодкі Беларускай Народнай Рэспублікі

**У праграме:**

**1.** Ускладанне кветак на магілах Серафімы і Лукаша Дзекуць-Малеяў і Козьмы Чурылы, гадз. 17⁰⁰, 25.03.2011 г., гарнізонны могільнік у Гданьску (за вакзалам ПКС, вул. ген. Дамброўскага, 2).

**2.** Канцэрт „Рэха" і Зміцера Вайцюшкевіча, гадз. 19⁰⁰, 25.03.2011 г., канцэртная зала Польскай камернай філармоніі, Сопат, вул. Манюшкі, 12 (уступ 10 і 20 зл).

**3.** Канцэрт „Рэха", гадз. 13³⁰, 26.03.2011 г., Гданьск, вул. Длуга, 50/51.

**4.** Ускладанне кветак да каменя ў гонар Янкі Купалы, гадз. 15³⁰, 26.03.2011 г., Гданьск-Аліва, вул. Я. Купалы.

**5.** Прэзентацыя гісторыі Беларусі Язэпа Найдзюка „Paznavajma historyju biełaruskaha narodu", гадз. 17⁰⁰, 26.03.2011 г., Сопат, вул. 3 Мая, 71.

## Запрашэнне

**З нагоды акту 25-га Сакавіка ў Фарным касцёле „белы" у суботу 26 сакавіка, у 17 гадзін адбудзецца імша на беларускай мове**

**запрашаюць вернікі**

ISSN 0546-1960